№ 34 (632) 9 верасня 2009

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Прыватызацыя: пшык на выхадзе**

Старонка 4

**Расія страціць Каўказ**

Старонка 7

**Чаму беларусы такія перасвараныя?**

Старонка 12

## У НУМАРЫ

**Круцялі сусветнага ўзроўню**

Беларускія пацаны атрымалі фальшывы палітычны прытулак у ЗША і зараблялі мільёны на нелегалах з былога СССР. **Старонка 6.**

**Як вы ставіцеся да ўсеагульнай дактыласкапіі**

Апытанне «НН». **Старонка 2.**

**Гісторыя народжаных пад Сатурнам**

Іх было ўсяго некалькі дзясяткаў — юнакоў, пасланых урадам Беларускай Народнай Рэспублікі на чэхаславацкую зямлю вучыцца. «Куфэрак Віленшчыны» адкрывае цудоўны раман аднаго з тых студэнтаў. **Старонка 11.**

**«Касметыка і дыеты — звычайная мужчынская справа»**

Сяргей Гумінскі лічыць сябе метрасэксуалам. **Старонка 15.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# БНФ узначаліў малады

**33-гадовы Аляксей Янукевіч атрымаў 174 галасы дэлегатаў. Лявону Баршчэўскаму не дапамаглі апеляцыі да падтрымкі Пазняка.**

Усяго на XII з'езд Партыі БНФ у Дом культуры МТЗ з'ехалася 326 дэлегатаў з 370 абраных. Над сцэнай зноў, як і на Кангрэсе Міколы Статкевіча, вісеў чырвона-зялёны сцяг. Здымаць яго строга забаранілі. Але франтаўцы скруцілі палотнішча так, што яго і бачна не было.

Напачатку працы дэлегаты заслухалі вітальнае слова Народнага паэта Рыгора Барадуліна. Сярод іншых гасцей найбольш увагі дасталося Аляксандру Мілінкевічу з Руху «За свабоду». Гэта было першае з'яўленне экс-кандыдата ў прэзідэнты на публіцы пасля аперацыі на суставе. Мілінкевіч віталі гучна. Палітык зазначыў, што цяпер патрэбнае аб'яднанне на ідэйным грунце — незалежнасці, еўрапейскага выбару. Ён выказаў скепсіс адносна працэдуры абрання кандыдата АДС, узгадаўшы, што адзіным можа стаць камуніст Сяргей Калякін. «І што, будзеце агітаваць за кандыдата, які за саюз з Расіяй?» — пытаўся ён БНФаўцаў з трыбуны. «Рух «За свабоду» не канкурэнт, а найбліжэйшы партнёр для БНФ», — зазначыў А.Мілінкевіч.

Архітэктар Лявон Зданевіч, які быў некалі ў Вярхоўнай Радзе ў фракцыі БНФ, прапанаваў Лявона Баршчэўскага на

**Партыя БНФ заклікала да стварэння нацыянал-дэмакратычнай кааліцыі.**

месца кандыдата на пасаду прэзідэнта. Зданевіча падтрымаў калега Баршчэўскага па Гуманітарным ліцэі Уладзімір Колас.

Адразу пасля справаздач Лявон Баршчэўскі прапаноўваў абмеркаваць пытанне будучага ўдзелу ў прэзідэнцкіх выбарах. З контрпрапановай выступіў Ігар Лялькоў — спачатку абраць кіраўніцтва партыі. Лялькоў перамог. Пытанне аб кандыдаце аднеслі на потым.

**Працяг на старонцы 3.**



**Аляксей Янукевіч**

нар. у 1976 у мінскай Чыжоўцы. У 1997 скончыў факультэт міжнародных эканамічных адносінаў БДЭУ па спецыяльнасці эканаміст-менеджэр. Намеснік старшыні Партыі БНФ ад 2003.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ




# Су-27 разбіўся праз эканомію на паліве?

**Такая версія ходзіць сярод баранавіцкіх лётчыкаў.**

На самалёце прыляцелі і збіраліся адлятаць назад у Беларусь. Таму запраўляліся па самыя вушы беларускім палівам. Каб не запраўляцца ў Радаме даражэйшым польскім.

Вага самалёта мае важнае значэнне. Пілоты ж рызыкнулі і яе перабралі. Свае фігуры дома яны круцяць на лёгкім самалёце, які запраўляюць толькі на адзін вылет. А на авіяшоу паводзіны машыны розніліся. Таму два палкоўнікі-асы і не далі рады кіраванню на выхадзе са складанай фігуры пілатажу.

Такое кажуць лётчыкі ў Баранавічах.

Беднасць беларускага абароннага ведамства выявілася ў тым, што магутны Су-27 не быў застрахаваны на сваю цану.

«На вялікі жаль, знішчальнік, што разбіўся, быў застрахаваны не на поўную суму. Адказнасць па ўсім абёме рызыкі складае толькі $900 тысяч», — паведаміла агенцтву «Інтэрфакс» гендырэктарка кампаніі «Прамтрансінвест» Любоў Сімончык.

Між тым, пасля аварыі расійскіх знішчальнікаў напярэдадні выставы МАКС-2009 расійскія СМІ ацэньвалі самалёт Су-27 у 30 млн даляраў ЗША.

Паводле словаў Сімончык, праз адносна невялікі памер страхоўкі перастрахаванне беларускага Су-27УБМ замежнымі страхоўшчыкамі не рабілася.

Акрамя таго, кожны з двух асаў-пілотаў Су-27УБМ, што загінулі, быў застрахаваны на $15 тыс., паведаміла кіраўніца «Прамтрансінвеста».

**Мікола Бугай**

**Бюджэт абароны, 2009, $млрд**

| | |
|---|---|
| Беларусь | 0,64 |
| Польшча | 8,3 |

**Вайсковыя расходы, на душу насельніцтва, $, 2008**

| | |
|---|---|
| Беларусь | 70 |
| Польшча | 203 |
| Краіны ЕС, члены НАТО | 410 |

## КАМЕНТАР РЭДАКЦЫІ

### Бедная армія

Беднасць Міністэрства абароны Беларусі не афішуецца. Замоўчванне мае пад сабой ідэалагічныя падставы. Нават у параўнанні з суседняй Польшчай, дзе нашы асы паказвалі свой клас, расходы Беларусі на абарону выглядаюць больш чым шчуплымі.

Выдаткі на абарону ў 2009 складуць, у адпаведнасці з дзяржбюджэтам, 1,73 трлн руб. Гэта ўсяго $0,64 млрд, калі пералічыць па сярэднегадавым курсе.

**Працяг на старонцы 2.**

**«Катапультуйся! Катапультуйся!!!»**

Расшыфроўка перамоваў беларускіх лётчыкаў з дыспетчарамі ў Радаме. **Старонка 8.**

# «А што тут такога?»

**У Мінску пасля мужчынаў «адкатаць пальчыкі» цяпер запрашаюць ужо і жанчынаў. Ці патрэбна масавая дактыласкапія ў нашай дзяржаве? Як ставяцца людзі да гэтых выклікаў у міліцыю? Мы апыталі людзей на вуліцы Мінска.**

**Кацярына, 18 гадоў, студэнтка:** Гэта нармальна. А што тут такога?

**Вольга, 18 гадоў, студэнтка:** Гэта нармальна, калі без прымусу. Я б і сама здала, чаго мне баяцца.

**Іна, 26 гадоў, лінгвіст:** Не, гэта ненармальна. А навошта? Калі чалавек з крыміналам звязаны, хай у турме бяруць адбіткі.

**Аляксей, 30 гадоў, юрыст:** Не трэба гэтага рабіць. Калі выклікаюць звычайных людзей і хочуць напалохаць ці націснуць на чалавека — гэта недобрасумленна. Ёсць жа розніца, калі шчыра папярэджваюць: «Вам не абавязкова, прыйдзіце, калі ласка». Іншая справа, калі кажуць: «Вы нам абавязаны, трэба з'явіцца». Не папярэджваць, што гэта неабавязковая працэдура — няправільна.

**Іван, 19 гадоў, студэнт:** Татальны кантроль. Гэта парушэнне нашага ўласнага права на індывідуальнасць.

**Валерый, 60 гадоў** (лічыць, што нават па гэтых дадзеных яго могуць вылічыць)**:** Мне гэта не падабаецца. Да ўсіх нашых сацыяльных хваляванняў і палітычных рашэнняў я стаўлюся адмоўна. Можна сказаць, што я апазіцыянер. Дактыласкапія — гэта заўсёды быў свет крымінальных справаў. І праводзіць масавую дактыласкапію — гэта ўжо пахне таталітарызмам. Я ж чую і бачу сам, што палова тэлефонаў праслухоўваецца, нельга сказаць лішняга слова, а тут яшчэ гэтая дактыласкапія.

**Часлава, 62 гады, пенсіянерка:** Гэта нармальна. Калі раптам штось, у міліцыі будуць адбіткі.

**Вячаслаў, 65 гадоў, пенсіянер:** Хай бяруць адбіткі, што ж тут дрэннага. Добраму чалавеку няма чаго баяцца. Мне толькі цяжка дайсці да міліцыі, здароўя няма, а я б ім падказаў, у каго з нашага двара трэба адбіткі першымі ўзяць.

**Гражына, 28 гадоў, хатняя гаспадыня** (гадуе дваіх дзяцей)**:** Можа, яны і ў сына майго возьмуць, трохгадовага? Калі ім няма чаго рабіць, хай прыходзяць і робяць. Дзеці з задавальненнем з імі пагуляюцца ў любую дактыласкапію. Але калі сур'ёзна гаварыць, то яны з пушкі па вераб'ях б'юць. Усіх правяраюць, а раптам адзін-два злодзеі знойдуцца.

**Апытвала Настасся Шамрэй**
**8 верасня**
**на вуліцы Залатая Горка**

## Макей: Няма Шміта — няма і офіса

Кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей падчас сустрэчы з кіраўніком мінскага Офіса АБСЕ Гансам-Ёханам Шмітам заявіў, што не бачыць сэнсу ў далейшым існаванні прадстаўніцтва.

«Беларускі бок вымушаны сур'ёзна задумацца над перспектывамі далейшай дзейнасці Офіса АБСЕ, у тым ліку ў адносінах прызначэння новага кіраўніка. Тым больш, аб'ектыўных прычын для прысутнасці АБСЕ ў Мінску няма», — лічыць сп.Макей.

Шміт пакіне сваю пасаду ўжо 10 верасня, але новы кіраўнік яшчэ невядомы.

Лідэр Партыі АГП Анатоль Лябедзька мяркуе, што беларускія ўлады даўно хочуць пазбавіцца прадстаўніцтва АБСЕ ў краіне: «Прысутнасць місіі АБСЕ сведчыць, што сітуацыя з правамі чалавека ў краіне кепская».

Палітык мяркуе, што закрыццё Офіса ёсць задачай максімум для ўладаў, задачай мінімум з'яўляецца вызначэнне кадравай палітыкі ў прадстаўніцтве: «І гэтую спакусу стварыў сам пасол Шміт. Офіс перастаў быць генератарам ідэй і ініцыятываў».

Аналітыкі мяркуюць, што далейшы лёс Офіса можа стаць адным з прадметаў гандлю ў перамовах ЕС і Беларусі.

**Зміцер Панкавец**

### КАМЕНТАР РЭДАКЦЫІ

## Бедная армія

**Працяг са старонкі 1.**

Для параўнання: у Польшчы бюджэт Мінабароны складае 8,3 млрд даляраў.

За мінулы, 2008 год, Беларусь выткраціла на ўтрыманне арміі 70 даляраў у пераліку на душу насельніцтва, тады як Польшча — 203.

Справа тут не ў міралюбстве адных і мілітарызме другіх — акурат-такі польскі прэзідэнт не любіць красавацца ў мундзіры з вялікімі зоркамі. Справа ў беднасці нашай краіны. Лукашэнкаўскія ўлады спачатку «ўратавалі краіну ад шокавай тэрапіі», а пасля і ад «хаосу, анархіі і нестабільнасці». У выніку краінай кіруе той самы чалавек, але Беларусь, якая ў 1990 годзе абганяла Польшчу па аб'ёме ВУП на душу насельніцтва, сёння безнадзейна адстае.

Лукашэнка абвінавачваў апазіцыю, што яна «хоча развваліць армію». Апазіцыя не мела магчымасці адказаць, да тэлебачання яе не падпускаюць. Ды зноў жа, маем прыклад Польшчы і Цэнтральнай Еўропы. Там 20 гадоў таму ўладу ўзялі сілы, блізкія па поглядах да беларускіх незалежнікаў. Усюды войскі перажылі мадэрнізацыю. У казармы прыйшоў «шведскі стол», фінансуюцца закупы тэхнікі і матэрыялаў.

У Беларусі ж рэальнае фінансаванне арміі, як і сацыяльных праграмаў, часта падмяняе прапагандысцкая траскатня.

Вынікі расследавання аварыі ў Радаме пакуль невядомыя. Аднак праблема навідавоку.

**Барыс Тумар**

### КОНКУРС

## «Сямейны Альбом 1989-2009»

Знайдзіце ў сямейных архівах здымкі–сведчанні эпохі пералому і абуджэння, што пачалася падзеннем Берлінскага мура. Даведайцеся іх гісторыю і зрабіце яе творчую пераапрацоўку — у эсэ ці інтэрв'ю, калажы ці малюнку, новым здымку ці фільме... Мовы конкурсу: нямецкая, беларуская, расійская.

Дасылайце свае працы з запоўненай анкетай: Інстытут імя Гётэ ў Мінску (на канверце пазначыць: Конкурс «Сямейны альбом»), вул. Фрунзе, 5, 220034 Мінск. Ці мэйлам: volontaer@minsk.goethe.org. Апошні тэрмін адпраўкі матэрыялаў — 30 верасня.

### СЦІСЛА

## Золатавалютныя рэзервы зноў скараціліся

У жніўні іх паменела на 140 млн даляраў (4,4%). На 1 верасня яны склалі $3,02 млрд. Такія звесткі Нацбанка. Тэмп падзення запаволіўся. У першым паўгоддзі рэзервы скарачаліся на пагрозлівыя $400 млн.

## Навукоўцам абяцаюць вялікія грошы

Указ №441 «Аб дадатковых мерах па стымуляванні навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці» падпісаў 7 верасня Лукашэнка. Ён дае магчымасць росту аплаты навукоўцам у топ-праектах і прыцягнення небюджэтных крыніц фінансавання.

## Arctic Sea перавозіў С-300 у Іран?

Сухагруз Arctic Sea вёз расійскія зенітна-ракетныя комплексы ў Іран. Аперацыі перашкодзіла ізраільская выведка «Масад». Яна арганізавала «захоп», але не вынесла інфармацыі на публіку, каб даць Крамлю захаваць твар. Такія звесткі мае лонданская «Times».

**МБ; інф. БелаПАН, БЕЛТА, The Times**

## Беларускі Калегіум прапануе

дадатковае навучанне па спецыялізацыях: журналістыка, найноўшая гісторыя, філасофія/літаратура, спецкурс па фатаграфіі.

Запрашаюцца студэнты старэйшых курсаў, асобы з вышэйшай адукацыяй.

Навучанне ў БК — бясплатнае. Пачатак заняткаў з 5 кастрычніка 2009 г. Запіс на сумоўе да 25 верасня.

Дадатковая інфармацыя: bk.baj.by, т.: (29) 276-27-15, (29) 679-26-82.

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка 3012 206 280 014 Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка 3012 206 280 014 Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытачоў газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакзу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Дзякуй

## за ахвяраванні

В.Ш. з Віцебскага раёна.
Генадзю К., Дзмітру В., Леаніле Г. з Мінскага раёна.
Канстанціну К., Барысу Ч., Міхасю Б. з Магілёва.
Віктару С. з Лепельскага раёна.
Уладзіміру Я. з Барысаўскага раёна.
Уладзіміру Ц. з Лагойскага раёна.
І.З., І.З. са Смалявіцкага раёна.
Чэславу В. з Ліды.
Фёдару К. з Талачынскага раёна.
В.Т. са Жлобінскага раёна.
Валерыі Д., Васілю К. з Гомеля.
Сяргею С. з Любанскага раёна.
А.Р. з Мастоўскага раёна.
Георгію С.з Бешанковіцкага раёна.
Ніне А., Ігару Дз., Сяргею А. з Брэста.
Анатолю Б. з Маладзечанскага раёна.
Аляксею Ш., А.А., Валерыі П., Алесю Б. з Баранавіцкага раёна.

# Алесь Міхалевіч таксама ідзе ў прэзідэнты

Палітык Алесь Міхалевіч мае намер вылучыць сваю кандыдатуру на прэзідэнцкія выбары 2010 года. Пра гэта ён заявіў у часе з'езда Партыі БНФ у суботу. З самой партыі яго выключылі праз канфлікт з Вінцуком Вячоркам і Лявонам Баршчэўскім. Таму на з'ездзе ён выступаў як намеснік старшыні грамадскага аб'яднання БНФ «Адраджэнне».

**«Наша Ніва»: Алесь, хто твая каманда?**

**АМ:** Гэта малавядомыя людзі, якія адбыліся ў сваім прафесійным жыцці, зарабляюць немалыя грошы. Гэта праграмісты, журналісты, прадпрымальнікі.

**«НН»: То бок яны беспартыйныя?**

**АМ:** У абсалютнай сваёй большасці так. Таксама ў абсалютнай большасці — гэта людзі маладыя.

**«НН»: А з Мілінкевічам як твае адносіны далей будуць развівацца?**

**АМ:** Мы знойдзем паразуменне. Але я збіраюся весці сваю выбарчую кампанію да пераможнага канца.

**«НН»: Якія ў цябе будуць лозунгі, тэмы?**

**АМ:** Пра гэта будзе сказана на афіцыйнай прэзентацыі.

**Гутарыў ЗП**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

На з'ездзе Партыі БНФ Міхалевіч трымаўся адасоблена.

**Алесь Міхалевіч**

нар. у 1975 у Мінску ў сям'і супрацоўнікаў Акадэміі навук. Вучыўся ў Гуманітарным ліцэі імя Якуба Коласа. Скончыў БДУ (1997) па спецыяльнасці «паліталогія». У 1993 уступіў у БНФ, быў адным з заснавальнікаў Задзіночання беларускіх студэнтаў (1995—1999). У 2008 выключаны з Партыі БНФ. Жанаты, гадуе дачку Лесю-Стэфанію, чакае другое дзіця.

## Даля Грыбаўскайтэ: Сустрэнуся з Лукашэнкам



Прэзідэнтка Літвы Даля Грыбаўскайтэ заявіла, што сустрэнецца з Аляксандрам Лукашэнкам, калі ён прыедзе ў Вільню. Мяркуецца, што кіраўнік Беларусі можа прыехаць у суседнюю дзяржаву 16 верасня для ўдзелу ў беларуска-літоўскім эканамічным форуме.

Прадстаўнік літоўскага МЗС Раландас Качынскіс перад гэтым заяўляў, што спісы ўдзельнікаў яшчэ не ўдакладнілі, але прозвішча Лукашэнкі насамрэч упамінаецца.

У сваю чаргу, сваякі зніклых — Зінаіда Ганчар, Вольга Завадская і Ульяна Захаранка — выказалі занепакоенасць магчымым візітам у Літву кіраўніка Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Яны звярнуліся з адкрытым лістом да Грыбаўскайтэ з просьбай прыняць усе меры, каб гэты візіт не адбыўся.

16 верасня будзе 10 гадоў з дня знікнення Анатоля Красоўскага і Віктара Ганчара.

**ЗП**

## БНФ узначаліў малады

Працяг са старонкі 1.

Падчас спрэчак, ужо ў другім выступе, Віктар Івашкевіч паведаміў, што не збіраецца вылучацца на пасаду старшыні, а вылучыў Лявона Баршчэўскага. Такая была хітрая тактыка.

Кандыдатуру Баршчэўскага падтрымлівала старая гвардыя БНФ — Валянцін Голубеў, Пятро Садоўскі, мінскі актыў. За Янукевіча выступілі тыя, хто на мінулым з'ездзе галасаваў за Алеся Міхалевіча, блізкія да Руху «За свабоду», падтрымала яго і «Моладзь БНФ».

Баршчэўскі апраўдваў сваё рашэнне балатавацца тым, што напярэдадні зрабіць гэта яго ўгаворваў Зянон Пазняк. «Я не прайграваў ніводных выбараў, пачынаючы ад выбараў старасты класа», — сказаў Л.Баршчэўскі.

І ўсё ж гэтыя выбары яму давялося прайграць. За Лявона Баршчэўскага прагаласавала 144 чалавекі, а за Аляксея Янукевіча — 174. Адразу пасля гэтых лічбаў Вінцук Вячорка, схапіўшы сумку, вылецеў з залы. Баршчэўскі і Івашкевіч павіншавалі новага старшыню.

Дэмарш старэйшага пакалення працягнуўся ў тым, што Валянцін Голубеў і Пятро Садоўскі адмовіліся ўваходзіць у склад новага Сойму. Толькі прафесар Хадыка стаічна маўчаў.

А з прэзідэнцкімі выбарамі вырашылі пачакаць. Адклалі вырашэнне гэтага пытання на вясну. І заклікалі да стварэння правацэнтрысцкай нацыянал-дэмакратычнай кааліцыі. У яе могуць увайсці Рух «За свабоду», Беларуская хрысціянская дэмакратыя, «Малады фронт», сам БНФ.

Намеснікамі Аляксея Янукевіча абраныя магілёвец Рыгор Кастусёў і мінчук Ігар Лялькоў. Сакратаром управы стане юрыст Уладзімір Лабковіч.

Змена пакаленняў на чале Партыі БНФ не азначае змены ідэалогіі. Янукевіч быў гадаванцам і любімцам Вячоркі і Баршчэўскага аж да таго часу, пакуль не схіліўся да альянсу з Мілінкевічам.

Моцны бок Янукевіча — добрая БДЭУшная адукацыя, якая дае яму лепшае разуменне эканамічных працэсаў.

**Зміцер Панкавец**

### Аляксей Янукевіч: Я супраць удзелу ПБНФ у праймерыз

**«Наша Ніва»: А не страшна ў такім маладым узросце ўзначаліць найстарэйшую партыю?**

**АЯ:** Не страшна. Адчуваю толькі адказнасць.

**«НН»: У праймерыз ад АДС партыя будзе ўдзельнічаць?**

**АЯ:** Гэта будзе вырашаць Сойм. Асабіста я супраць.

**«НН»: Як адзначыў перамогу?**

**АЯ:** Па шчырасці, хацелася проста добра выспацца.

**Гутарыў ЗП**

www.svaboda.org

сьвет свабоды

навіны

блогі

онлайны

фота

відэа

падкасты

больш чым радыё

## СЦІСЛА

### Крымiналка па кожнай трэцяй праверцы

За 8 месяцаў «фінансавая міліцыя Камітэта дзяржкантролю правяла 2754 праверкі, завяла 990 крымінальных справаў, накіравала ў суд 367 матэрыялаў», — паведаміў у панядзелак у сваім дакладзе старшыня Камітэта дзяржкантролю (КДК) Зянон Ломаць.

### Аміга прыляцеў

У Мінск прыбыў прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес. Увечары ў загараднай рэзідэнцыі Заслаўе ён сустрэўся з Аляксандрам Лукашэнкам.

### Балгарыя хоча адмовіцца ад пабудовы АЭС Расіяй

Прэм'ер-міністр Расіі У.Пуцін не выключае магчымасці зрыву рэалізацыі некаторых буйных энергетычных праектаў у Балгарыі. Падчас сустрэчы балгарскі прэм'ер Барысаў паведаміў, што ягоны ўрад працягне аналіз мэтазгоднасці рэалізацыі праектаў будаўніцтва АЭС «Белене» і нафтаправода «Бургас-Александрупаліс». Дамовы з Расіяй заключаў папярэдні, сацыялістычны ўрад.

### Афіцэры Пiначэта адкажуць за рэпрэсіі

У Чылі арыштаваныя 129 былых саратнікаў дыктатара Аўгуста Піначэта. Супраць іх заведзеная крымінальная справа па абвінавачванні ў масавым парушэнні правоў чалавека. Адстаўныя афіцэры тайнай паліцыі абвінавачваюцца ў гвалтоўных выкраданнях і забойствах камуністаў-апазіцыянераў, здзейсненых трыццаць гадоў таму.

### Вялікая дэлегацыя апазіцыі едзе ў Стакгольм

16-18 верасня запланаваны візіт дэлегацыі беларускай апазіцыі, а таксама прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасцю ў Швецыю. У дэлегацыю ўвайшлі А.Казулін, А.Лябедзька, В.Вячорка, П.Севярынец, У.Навасяд, А.Фінькевіч, Ж.Літвіна. Запланаваныя сустрэчы з міністрам замежных справаў, а таксама з міністрам па справах Еўропы.

### У Мінску чакаюць высокага прадстаўніка Ватыкана

Старшыня Папскай рады кардынал Вальтэр Каспер дзеля спрыяння хрысціянскаму адзінству наведае Беларусь. На запрашэнне мітрапаліта Філарэта ватыканскі іерарх возьме ўдзел у канферэнцыі, якая пройдзе ў Мінску 9—11 лістапада 2009 года і будзе прысвечана хрысціянска-юдэйскаму дыялогу.

**МБ, ЗП**

# Прыватызацыя: пшык на выхадзе

Курс на маштабны продаж прадпрыемстваў, абвешчаны ўладай улетку 2008 года, далёкі ад выканання. Згодна з планам прыватызацыі аб'ектаў, якія знаходзяцца ў рэспубліканскай уласнасці, за 2008—2010 гады трэба было прадаць 519 прадпрыемстваў. На выхадзе пакуль што пшык.

### Без агенцтва не разабрацца

Працэдура куплі прадпрыемстваў занадта ўскладненая, лічыць эканаміст даследчага цэнтра ІПМ Аляксандр Чубрык. З гэтым згодны і сусветныя фінансісты.

Адно з патрабаванняў Міжнароднага валютнага фонду — стварэнне спецыяльнага прыватызацыйнага агенцтва. Хутчэй за ўсё, яно будзе падпарадкоўвацца непасрэдна Адміністрацыі прэзідэнта. Агенцтва мусіць спрасціць продаж беларускіх прадпрыемстваў замежнікам. Рыхтуюцца і змены ў заканадаўстве — з тымі ж мэтамі спрашчэння. Выглядае на тое, што праз год пасля абвяшчэння палітыкі прыватызацыі рухавік нарэшце пачне раскручвацца.

### Прыватызацыя да часу «Х»

Раней Лукашэнка баяўся прыватызацыі як заразнай хваробы. Калі да яе і прыходзілася звяртацца, то гэта былі змушаныя дзеянні. Калі гандляваліся за цану з расійскім «Газпромам», прыйшлося прадаваць акцыі «Белтрансгазу». Пагражала банкрутства «Мотавела» — збылі за $7,2 млн аўстрыйцам. Калі банальна не хапала грошай для ўтрымання курсу рубля, у тую ж Аўстрыю аддалі за $556 млн «Velcom». Ва ўсіх гэтых выпадках дзяржава прадавала сваю долю акцый.

Крызіс прымусіў задумацца. Прадпрыемствы сталі ўспрымацца не толькі як нацыянальнае багацце, але і як сродак папаўнення бюджэту, няхай і аднаразовы. План прыватызацыі быў прыняты, але яго рэалізацыі давялося чакаць. З буйных продажаў летась была толькі здзелка з туркамі наконт «БеСТа». Тады 80% акцый трэцяга беларускага аператара мабільнай сувязі былі ацэненыя ў $600 млн.

### Што збіраюцца прадаваць?

«Прыватызацыйны» спіс на 2009 год складае 176 прадпрыемстваў. Іх можна набыць цалкам. Яшчэ ў 159 акцыянерных таварыствах можна набыць частку акцый, якія належаць дзяржаве.

Паводле крэдытных дамоваў з Міжнародным валютным фондам Беларусь мусіць прадаць два дзяржаўныя банкі — «Белпрамбудбанк» («БПС-банк») і «Белінвестбанк». Пакупнікі на іх шукаюцца. Зацікаўленасць у першым выказвае расійскі «Сбербанк», наконт продажу другога пакуль пэўнасці няма.

У спісе шмат тэкстыльных фабрык. Відавочна, што лёгкую прамысловасць з радасцю аддадуць у прыватныя рукі, бо крызіс у ёй пачаўся яшчэ 15 гадоў таму, з прыходам таннай кітайскай прадукцыі. А вось малочных прадпрыемстваў, пра якія марыць Расія, у пераліку няшмат. Транспартныя перавозкі, лічыць дзяржава, таксама танней прыватызаваць, чым кантраляваць. Аўтапаркі па ўсёй краіне прадаюцца дзесяткамі.

Заўсёдны аргумент дзяржавы супраць прыватызацыі быў такі — «прыватнік не дбацьме пра людзей». Тым не менш, нават прадпрыемствы з вялікай колькасцю працаўнікоў гатовыя пайсці ў прыватныя рукі. Завод паўправадніковых прыбораў, завод «Транзістар» і нават абаронны Мінскі завод колавых цягачоў — кожны з іх мае больш за 2,5 тысячы працаўнікоў. На апошні могуць прэтэндаваць хіба што «Росвооружения».

Пра што гаварыць, калі нават БелАЗ з яго 12 тысячамі працаўнікоў стаіць у сёлетняй чарзе на продаж.

### Нафтаправодамі водзяць перад носам

Дзяржаўны план па прыватызацыі змяняецца ўвесь час. Адны прадпрыемствы адтуль выкідаюцца, іншыя — дадаюцца. «Інвестара пакуль што няма. Акцыянаванне не ўзмоцніць інвестыцыйную прывабнасць», — заяўляў генеральны дырэктар «Гомсельмаша» Валерый Жмайлік. Да яго прыслухаліся. Прадпрыемства вырашылі не чапаць да 2011 года.

На наступны год перасунулі прыватызацыю паплатных нафтавых «Гомельтранснафта Дружба» і наваполацкую «Дружбу». Ад продажу Мінскага прыборабудаўнічага завода ўвогуле адмовіліся.

Зрэшты, тое, што прадпрыемствы вылятаюць са спісу на продаж, не значыць, што дзяржава канчаткова вырашае пакінуць іх у сябе. Мінскі парцалянавы завод як быццам бы ўжо не прадаваўся, нават з'явілася інфармацыя пра ліквідацыю прадпрыемства, але раптоўна ўзнікла прапанова аб продажы ад «Белсвісбанка» — і дзяржава згадзілася.

### Расіяне прыйшлі ў Шклоў

За апошні час паспяховых угодаў было небагата. Стварылі сумеснае прадпрыемства расійская кампанія «Юнімілк» і Шклоўскі масларобчы завод. Фінская кампанія Olvi выкупіла яшчэ частку акцый «Лідскага піва»... Большасць з такіх кантрактаў ацэньваецца ў некалькі мільёнаў даляраў. Зусім не тое, чаго чакаў урад.

— Інтарэс замежных кампаній да беларускіх прадпрыемстваў ёсць, але паўстае пытанне пра цану, — мяркуе Аляксандр Чубрык.

Сапраўды, Лукашэнка не стамляецца паўтараць, што «як жорстка мы ставіліся да пытанняў прыватызацыі, так ставімся і зараз». Дзяржава не ідзе на саступкі, а замежнікі чакаюць зніжак. Расійскі «Еўрахім» хацеў купіць пакет акцый Гомельскага хімічнага завода за $110 млн, матывуючы нізкі кошт цяжкімі крызіснымі часамі. Беларусь катэгарычна адмовілася ад таннай прапановы. Гомельскі хімічны вырабляе фосфарныя ўгнаенні на аснове фасфарытаў з Кольскага паўвострава.

Эканаміст Яраслаў Раманчук лічыць, што закон аб прыватызацыі можа запрацаваць толькі з 2010 года.

### Фактар Расіі

Насцярожвае той факт, што абсалютная большасць інвестыцыйных і прыватызацыйных праектаў ажыццяўляецца з удзелам расійскага боку. У першым паўгоддзі 2009 года ўсходнія суседзі ўклалі ў Беларусі $2,1 млрд прамых інвестыцый. Доля Расіі склала ажно 86,6%! Занадта вялікая доля сродкаў адной краіны можа скласці небяспеку для развіцця другой эканомікі.

### Актыўнасць чакаецца з лістапада

Да лістапада гэтага года Беларусь паабяцала выставіць на продаж пяць буйных дзяржаўных прадпрыемстваў. Такім было яшчэ адно патрабаванне Міжнароднага валютнага фонду. Калі да гэтага часу будуць падрыхтаваны адпаведныя ўмовы, можна чакаць заключэння доўгачаканых кантрактаў з замежнымі кампаніямі. Але першы год прыватызацыі аказаўся няздзейсненым. Не выключана, што ўсе размовы аб прыватызацыі былі толькі чуткамі, пушчанымі ў вушы МВФ.

**Ягор Марціновіч**

**Акрэсленыя патрабаванні для замежных пакупнікоў. Тыя мусяць:**

— мець сродкі для ўкладвання інвестыцый;

— працаваць у аналагічнай галіне эканомікі;

— мець рынкі збыту.

## СЦІСЛА

### $3,8 млн на пераможцаў «Дажынак»

На ўзнагароджанне пераможцаў «Дажынак» выдаткавана 10,7 млрд рублёў. Год таму ўклаліся ў 7,4 млрд рублёў, але была ж дэвальвацыя. Для пераможцаў у конкурсе сярод абласцей прадугледжана прэмія ў $35 тысяч, сярод раёнаў — шэсць прэмій па $17,5 тысяч.

### Беларускія мабільнікі

Прадпрыемства «Мастоўская сельгастэхніка» да канца года плануе наладзіць выпуск мабільных тэлефонаў для пенсіянераў. У мабільніках зробяць вялікія кнопкі і вялікі экран. Тэлефон будзе максімальна танным.

### Расійцы за мяжой беднасці

Колькасць расійцаў, якія атрымлівалі даходы, ніжэйшыя за пражытквы мінімум, склала 24,5 мільёна чалавек. Гэта 17,4% ад агульнай колькасці насельніцтва. Кожны шосты расіец жыве за мяжой беднасці.

### Калькулятар для падліку доўгу

Спецыяльны калькулятар для падліку нацыянальнага доўгу створаны ў ЗША. На ім досыць зручна працаваць з гіганцкімі лічбамі, такімі, напрыклад, як 11 800 000 000 000. Менавіта столькі, 14 лічбаў, утрымлівае нацыянальны доўг амерыканцаў.

### Зэльвенская ЦЭС каштуе $1,5 млрд

Каб збудаваць Зэльвенскую вугальную электрастанцыю, трэба прыкладна $1,3-1,5 млрд. Мяркуецца, што прафінансуюць будоўлю палякі, а электраэнэргія часткова будзе накіроўвацца ў Польшчу.

### Грошы ў пясок

Кітайская нафтавая кампанія PetroChina ўкладзе $1,7 млрд у два праекты асваення нафтаносных пяскоў у Канадзе. Запасы тамтэйшых радовішчаў ацэньваюцца ў 5 млрд барэляў нафты. Агулам запасы нафты ў пясках Канады складаюць каля 173 млрд барэляў. Больш запасаў мае толькі Саудаўская Аравія.

### Венесуэльская нафта нарасхват

Услед за Беларуссю стварыць сумесныя прадпрыемствы з Венесуэлай хоча і Расія. «Лукойл» выказаў намер супрацоўнічаць з паўднёваамерыканцамі.

**ЯМ**

## БЕЛАРУСЬ-ЕЎРАСАЮЗ

# Праграмы дапамогі ЕС у Беларусі

Еўрапейскі Саюз займаецца вырашэннем глабальных пытанняў — такіх як беднасць, голад, стан навакольнага асяроддзя, правы чалавека, здароўе, адукацыя. ЕС таксама рэалізуе ў краінах усяго свету праграмы і праекты, што садзейнічаюць належнаму кіраванню, развіццю чалавечых рэсурсаў, сацыяльнаму развіццю, бяспецы, міграцыі і інш. Вядучая роля ў гэтым працэсе належыць Еўрапейскай Камісіі, да чыіх функцый адносіцца кіраванне праграмамі вонкавай дапамогі Еўрапейскага Саюза і дапамога па развіцці ва ўсім свеце.

Дапамога, якая даецца Еўрапейскім Саюзам трэцім краінам (г.зн. краінам, якія не з'яўляюцца сябрамі ЕС), аказваецца праз так званыя інструменты вонкавай дапамогі. У наш час вонкавая дапамога ЕС складае больш за 10% ад афіцыйнай дапамогі развіццю, а разам з дапамогай дзяржаваў — сяброў ЕС яе аб'ём дасягае 55%. Афіцыйная дапамога развіццю — гэта міжнародная тэхнічная, гуманітарная дапамога краінам у стадыі развіцця ці краінам з пераходнай эканомікай, наданне ім крэдытаў і пагашэнне іх вонкавай запазычанасці на ільготных умовах замежнымі дзяржавамі ці міжнароднымі арганізацыямі (донарамі) для паспяховага ажыццяўлення сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў у гэтых краінах.

ЕС з'яўляецца найбуйнейшым сусветным донарам вонкавай дапамогі. Партнёрамі ЕС з'яўляюцца звыш 160 дзяржаваў, тэрыторый і рэгіянальных арганізацый. Больш чым дзве траціны вонкавай дапамогі ЕС падаецца бязвыплатна. Асноўным выглядам дапамогі, якая даецца ЕС Беларусі, з'яўляецца міжнародная тэхнічная дапамога — новыя тэхналогіі, кансультатыўныя паслугі, экспертныя адзнакі, навучанне, бізнэс-планы, інвестыцыі.

### Праграма тэхнічнай дапамогі «Тасіс»

Адна з найболей вядомых праграм ЕС, накіраваных на аказанне дапамогі краінам былога Савецкага Саюза, уключаючы Беларусь, — праграма тэхнічнай дапамогі «Тасіс», якая дзейнічала з 1991 па 2006 г. Яе асноўнай мэтай было паскарэнне працэсу эканамічных і палітычных змен у гэтых краінах. «Тасіс» даваў фінансаванне на рэалізацыю праграм у шматлікіх сферах. У прыватнасці, на падтрымку іституцыйных, прававых і адміністрацыйных рэформаў; садзейнічанне эканамічнаму развіццю, абароне навакольнага асяроддзя, кіраванню прыроднымі рэсурсамі; на падтрымку прыватнага сектара; на развіццё інфраструктурных сетак; на падвышэнне ядзернай бяспекі.

З самага пачатку заданне «Тасіс» было вызначана як «падтрымка працэсу пераходу да рынкавай эканомікі і дэмакратычнаму грамадству ў краінах Усходняй Еўропы, Паўднёвага Каўказа і Цэнтральнай Азіі». У праграму ўвесь час уносілі істотныя змены, каб забяспечыць яе гнуткую адаптацыю да новага асяроддзя і адпаведнасць новым патрабаванням.

За 15 гадоў існавання праграмы «Тасіс» яе агульны бюджэт склаў 7,3 мільярда еўра, а сама праграма стала брэндам дзейснай дапамогі і супрацоўніцтва з Еўрапейскім Саюзам. Яна ініцыявала працэсы, якія ў большасці выпадкаў падрыхтавалі спрыяльную глебу для істотных змен у грамадскай, эканамічнай і іншых прыярытэтных абласцях жыцця краін-партнёрак ЕС.

Аб'ём тэхнічнай дапамогі, прадстаўленай Еўрасаюзам Беларусі ў перыяд з 1991 па 2006 г., ацэньваецца ў 216 мільёнаў еўра, што складае звыш 40% усёй атрыманай Беларуссю тэхнічнай дапамогі за дадзены перыяд. Гэта сведчыць пра тое, што для гэтай краіны ЕС з'яўляецца найбуйнейшым шматбаковым донарам тэхнічнай дапамогі.

На працягу 1991—2006 гг. тэхнічная дапамога Беларусі ў рамках праграмы «Тасіс» ажыццяўлялася па такіх кірунках:

- нацыянальная праграма — 74,5 млн еўра;
- рэгіянальная праграма — 68,0 млн еўра;
- праграма па ядзернай бяспецы — 5,5 млн еўра;
- праграмы малых праектаў («Тэмпус», кансультаванне па пытаннях палітыкі, падвышэнне эфектыўнасці кіравання, выкананне міжнародных стандартаў і забавязанняў) — 11,5 млн еўра;
- праграмы па трансмежным супрацоўніцтве — 46,2 млн еўра;
- праграмы суседства — 11,3 млн еўра.

Еўрапейскі Саюз — найбуйнейшы шматбаковы донар тэхнічнай дапамогі Беларусі.

Тэхнічная дапамога ЕС Беларусі ў гэты перыяд надавалася ў выглядзе кансультацый, навучанні адмыслоўцаў, паставак абсталявання, рэалізацыі пілотных праектаў у такіх абласцях як правасуддзе і ўнутраныя справы, ахова навакольнага асяроддзя, уладкаванне памежнай інфраструктуры, сацыяльная абарона, ядзерная бяспека, адукацыя, стандарты, сертыфікацыя, метралогія, мясцовае кіраванне. Асноўнымі атрымальнікамі міжнароднай тэхнічнай дапамогі ЕС у Беларусі з'яўляліся Міністэрства прыроды, Міністэрства ўнутраных справаў, Дзяржаўны памежны камітэт, Дзяржаўная мытня, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства адукацыі, аблвыканкамы, грамадскія аб'яднанні.

# Лукашэнка не прыехаў у Баранавічы

Ён аддаў перавагу кансерваваму заводу ў Тураве. Піша **Сямён Печанко**.

«Кіраўнік дзяржавы азнаёміцца з ходам прац па ўборцы кукурузы і новымі распрацоўкамі беларускіх сельгасмашынабудаўнікоў, а таксама наведае кансервавы завод у Тураве», — паведаміла АНТ у выніковым выпуску навінаў. Здавалася б, шараговы сюжэт, звыклыя піяр-інспекцыі палеткаў вакол летняй рэзідэнцыі ў часе жніва. Калі б не адна акалічнасць — першай навіной у тым начным выпуску было паведамленне пра прылёт з Польшчы вайсковага самалёта з целамі пілотаў.

У Баранавічах польскі генерал называе нашых лётчыкаў героямі, а ў Тураве Лукашэнка выказвае незадаволенасць працай кансервавага завода. Кіраўнік дзяржавы некалькі разоў на год прымярае вайсковы мундзір, а не прыехаў 3 верасня на развітанне з баранавіцкімі пілотамі.

Можна здагадвацца аб прычынах такога ігнаравання. Гэта такі своеасаблівы клопат пра ўласны імідж — унікаць атаясамлення ўласнай асобы з трагедыямі. У любым выпадку, такія паводзіны кіраўніка Беларусі рэзка кантрастуюць з дзеяннямі ягоных замежных калегаў у падобных сітуацыях. Цяжка ўявіць сабе Нікаля Сарказі, які б у такі момант паехаў інспектаваць вінаграднікі ці вінзаводзік недзе побач з Пірэнеямі.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Чаргінец: Рубінаў параіў ігнараваць мяне

Старшыня Грамадскае рады па маральнасці спыніўся на этыцы адносінаў унутры дзяржапарату і зачапіў тэмы асабістага жыцця Лукашэнкі.

2 верасня Мікалай Чаргінец правёў прэс-канферэнцыю, на якой расказаў пра задачы і мэты Грамадскае рады па маральнасці, якую генерал і ўзначальвае.

Сенатар пачаў з дэмаграфічнай праблемы, п'янства, праблемы сям'і і дзяцей. Прывёў прыклад «бяздушнага стаўлення» чыноўнікаў:

— На адным пасяджэнні чыноўнікі дакладалі, што яны ўсё робяць для таго, каб змагацца з няплатнікамі за святло, за ваду, за цяпло. І ў адной кватэры застаўся хлопчык 11 гадоў, ягоныя малодшыя сямігадовая сястрычка і чатырохгадовы брацік. Маці-адзіночка чатыры месяцы таму сышла з дому. Старэйшы хлопчык выхоўвае брата і сястру. А чыноўнік дакладае, што яны адключылі ў гэтай сям'і газ і цяпло. Гэта была зіма. Ці не абавязак нашага грамадства вырашаць гэтыя пытанні?


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Мікалай Чаргінец скардзіўся на ўсіх, хто перашкаджае ці не ўмее працаваць. Незалежную прэсу амаль пахваліў:

— Калі мы правялі першае пасяджэнне Грамадскае рады па маральнасці, ніводная дзяржаўная газета не сказала пра нас. Прагучала інфармацыя ў недзяржаўных СМІ. І дастаткова лаяльна. Я не магу сказаць, што яны нас высмейвалі.

Генерал патлумачыў, чаму дзяржаўная прэса нічога не напісала:

— Я ведаю, чаму. Бо спадар Рубінаў (Анатоль Рубінаў, віцэ-спікер савета рэспублікі, а раней намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта па ідэалогіі — аўт.) выступіў супраць царквы. Напэўна, помніце яго артыкул у «Савецкай Беларусіі». І парэкамендаваў некаторым «работнічкам» дзяржаўных СМІ ігнараваць і Чаргінца, і вось такія мерапрыемствы. Недалёкі гэты акадэмік аказаўся, які не разумее, што такое чалавечая прыстойнасць, асабліва чыноўніка, і які не разумее важнасці пытанняў, якія трэба вырашаць у краіне.

На прапанову Рады паспрыяць у з'яўленні прэзідэнта на публіцы разам з сям'ёй, генерал адказаў:

— Складаная справа — сям'я. І нам лезці з рыдлёўкай ці кіркай у душу чалавека і патрабаваць: «раскажы, мне цікава, як ты там...» не варта. Для краіны і для народа важна, каб быў лідэр, які б рашаў іх інтарэсы. Трэба ж разумець, што нам патрэбна. Бо і ў палітыцы робіцца рэчы, якія трэба рабіць у інтарэсах мільёнаў людзей, у інтарэсах краіны. Не патрабуйце нават ад прэзідэнта такіх рэчаў, якія далёкія ад нашага разумення. Што, нам лягчэй стала, каб ён раскрыў сакрэт чыста інтымнага, сямейнага парадку? І жонка яго не гаворыць. Здавалася б, калі яна пакрыўджаная, магла б сказаць, былая яго. Так што давайце не будзем у гэта ўмешвацца. Хай Лукашэнка добра кіруе нашай краінай.

**Сяргей Макарэвіч**

**Грамадская рада па маральнасці**

была створаная сёлета ў ліпені на прапанову Беларускай праваслаўнай царквы і Саюза пісьменнікаў Беларусі. Узначаліў яе Мікалай Чаргінец. У раду ўвайшлі прадстаўнікі вялікіх канфесій, якія дзейнічаюць у Беларусі. У яго шэрагах мітрапаліт Філарэт, арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч, кампазітар Ігар Лучанок і іншыя.

## Пазняк: Выбары трэба байкатаваць

Дзіўным выглядае для мяне рашэнне [аднаго з лідэраў Партыі БНФ — НН] Баршчэўскага ўдзельнічаць у будучых выбарах прэзідэнта разам з Лукашэнкам. Дэмакратычных і справядлівых выбараў не будзе. Выбарчае заканадаўства не зменяць. А незаконны ўдзел Лукашэнкі ў


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

такіх выбарах зробіць іх увогуле крымінальным мерапрыемствам па чарговым захопе ўлады. У які, для прыкрыцця, пастараюцца ўцягнуць паболей выбаршчыкаў і прэтэндэнтаў. І нішто не спыніць узурпатара ад такіх дзеянняў.

Выбары ў Беларусі — ужо даўно не выбары. Удзел выбаршчыкаў у галасаванні — гэта шырма для фальсіфікацый. Сама логіка падказвае, што трэба пазбавіць рэжым яго шырмы. Трэба не даць яму прыкрывацца народам. Мусіць быць байкот.

**Цыт. паводле радыё «Свабода»**

## Пуцін і 27 мільёнаў

У Расіі любяць называць усё расійскае славянскім, каб пасля называць усё славянскае расійскім. Прыкладна такая камбінацыя адбываецца і з памяццю пра вайну. Піша **Барыс Тумар**.

Напярэдадні візіту ў Польшчу на 70-годдзе пачатку вайны ў сваім артыкуле ў «Газэце выборчай» Пуцін напісаў: «Калі прэм'ер Польшчы спадар Дональд Туск накіраваў мне запрашэнне на ўрачыстасці, прысвечаныя гадавіне выбуху Другой сусветнай вайны, я прыняў яго без вагання. Папросту, не мог зрабіць інакш. Бо тая вайна забрала жыццё 27 мільёнаў маіх суайчыннікаў».

Калісьці, у сярэдзіне XIX стагоддзя, пранікліва лідэр чэшскага нацыянальнага руху Гаўлічак заўважыў: у Расіі любяць называць усё расійскае славянскім, каб пасля называць усё славянскае расійскім.

Нешта падобнае адбываецца цяпер з памяццю пра вайну.



Расійская прапаганда выпячвае «супольнасць подзвігу», каб русіфікаваць гістарычную свядомасць народаў былога СССР.

У 27 мільёнаў гісторыкі ў часы Гарбачова ацэньвалі ахвяры рэспублік СССР у вайне. Усяго СССР, не Расіі. Называючы гэтыя 27 мільёнаў суайчыннікамі, Пуцін падае сябе ў ролі гаспадара ўсяго былога СССР. Сталін высцеліў дарогу да перамогі мільёнамі трупаў, апладзіў бяздарнасць свайго рэжыму крывёй. Пуцін працягвае выкарыстоўваць гэтыя ахвяры.

Дзякуй, не трэба. Спачатку з Расіяй разбярыцеся. А мы ўжо неяк самі. Без вас. Мы — асобныя нацыі.

Гэтая лічба — 27 мільёнаў — гаворыць і пра тое, што ў сёняшняй Расіі многа трубадураў-паліттэхнолагаў, але мала гісторыкаў. Расія дасёння не злічыла дакладна сваіх стратаў. У гэтай лічбе Пуціна не толькі імперская непавага да самастойнасці суседніх нацый, але і абыякавасць — мільён туды, мільён сюды — да ўласных людзей, якія застаюцца толькі «чалавечым матэрыялам».

Не, гэта не дзяльба ахвяраў.

Гэта пытанне аб тым, як выпрацаваць такую гістарычную свядомасць, пры якой новая вайна ў цэнтры Еўропы стала б немагчымай.

# Круцялі сусветнага ўзроўню

**Беларускія пацаны атрымалі фальшывы палітычны прытулак у ЗША і зараблялі мільёны на нелегалах з былога СССР.**

Суд штата Вірджынія асудзіў 27-гадовага беларуса Пятра Баравіка на пяць гадоў пазбаўлення волі. Ён быў падзельнікам іншага беларуса, эмігранта-мільянера Віктара Круся, асуджанага ў ліпені гэтага года на 7 гадоў.

Крусь зарабіў аж 34 мільёны даляраў, пастаўляючы нелегальных эмігрантаў для працы на курортах. Ён добра вывучыў амерыканскае заканадаўства і пяць гадоў паспяхова яго абыходзіў, аж пакуль міграцыйныя службы не напалі на ягоны след.

Акруговы суддзя Марк Дэвіч у сваім слове на працэсе адзначыў, што такі здатны чалавек як Крусь мог зарабіць мільёны на законных падставах, але зарабіў сем гадоў за кратамі.

Гісторыя эмігранта-мільянера пачалася ў 2003 годзе, калі ён яшчэ студэнтам прыехаў у ЗША на летнія канікулы. У яго быў свой план. Ён папрасіў палітычнага прытулку як актывіст апазіцыйнага руху «Зубр». Уладкаваўшыся, ён сабраў каманду з такіх жа эмігрантаў, як і ён, і пачаў зарабляць грошы на нелегалах з Усходняй Еўропы.

Схема выглядала наступным чынам: ён сяліў працаўнікоў па 12-15 чалавек у адну кватэру і ўладкоўваў на працу ў гатэлі, рэстараны, аўтамабільны завод «Форд». У той час, калі іх заробак у гадзіну складаў 10 даляраў, Крусь плаціў ім сем, а астатняе забіраў у якасці платы за арэнду, уніформу і іншыя неабходныя рэчы. У змову ўступілі і некаторыя кіраўнікі гатэляў: яны адмыслова адмаўлялі амерыканцам у працы, каб пакінуць месцы для нелегалаў. З гэтага яны мелі свой навар.



Сяброўцы Круся Кацярыне Чараднічэнка давядзецца чакаць яго сем гадоў.

Паводле рашэння акруговага суда ЗША, Віктара Круся прыгаварылі да сямі гадоў і трох месяцаў турэмнага зняволення. Ён прызнаў сябе вінаватым у махлярстве ды адмыванні грошай і папрасіў прабачэння ў зале суда перад амерыканскай нацыяй. Ён таксама ўвесь час садзейнічаў следству, дзякуючы чаму і атрымаў такі тэрмін, хаця мог загрымець і на 14 гадоў.

Агулам ад 2003 да 2008 года Крусь зарабіў 34 мільёны даляраў. Нават пасля адбыцця тэрміну Віктар застанецца багатым чалавекам: каля 1,6 мільёнаў ён паспеў перавесці ва Усходнюю Еўропу.

Яшчэ 23 абвінавачаныя, памочнікі Круся, разглядаюцца следствам па гэтай справе.

Асуджаны Пётр Баравік прыехаў у ЗША ў 2003 годзе таксама як актывіст «Зубра» і атрымаў палітычны прытулак у 2004.

Следства высветліла, што Баравік зарабіў за час працы на Круся каля 233 тысяч даляраў — у сярэднім 50 тысяч за год.

Асуджаныя ў ЗША беларусы насамрэч не з'яўляліся актывістамі «Зубра». Ніхто з былых удзельнікаў арганізацыі ніколі не чуў прозвішчы гэтых маладых людзей. Пасля адбыцця тэрміну беларусы будуць дэпартаваныя на радзіму.

**Вольга Жарнасек;**
**інф. газеты The Virginian Pilot**

### ЯК ГЭТА БЫВАЛА

**Расказвае Уладзімір Скрабатун, рэдактар незалежнага тыднёвіка «Вольнае Глыбокае»:**

У свой час, калі я быў старшынёй Глыбоцкай арганізацыі БНФ, да мяне часта звярталіся важныя мясцовыя дзядзькі, каб я іхнім пушыстым дзеткам напісаў характарыстыку, што, маўляў, яны стаялі ў пікетах у Глыбокім і пацярпелі ад уладаў. І дзе вы думаеце тыя дзеткі вучыліся? У Інстытуце кіравання пры прэзідэнце РБ! Даляры піхалі мне ў кішэні. Але я сваё сумленне не стаў прадаваць. Хоць прыйшлося наслухацца ў свой адрас... Але знаходзіліся, пэўна, больш згаворлівыя. Тыя махлярыкі паспяхова выехалі ў Амерыку ці Англію.

## Абганяючы па правай узбочыне, кіроўца забіў чацвярых

**Страшная аварыя пад Плешчаніцамі на трасе Мінск—Віцебск.**

ДТЗ адбылося каля 19.30 у раёне Плешчаніц. 29-гадовы мінчук абганяў на «Аўдзі-100» па правай узбочыне машыну «Рэно-19», якой кіравала 24-гадовая жыхарка Чашніцкага раёна. Ды не разлічыў і сутыкнуўся з ёй. «Рэно» выкінула на сустрэчную паласу. Проста пад колы фуры «Сканія».

У выніку загінулі кіроўца «Рэно» і яшчэ трое пасажыраў — 46-гадовая мінчанка, яе 25-гадовая дачка і двухгадовы ўнук.

Зрэшты, паводле паказанняў аднаго з відавочцаў, кіроўца «Аўдзі» не так і вінаваты. «Так, прысутнічаў манеўр, які называецца абгонам, але выконваўся ён па-чалавечы — са спробай выезду на сустрэчную. А вось кіроўца «Рэно» ў неадпаведны момант рэзка тармазнула, справакаваўшы ўсе наступныя крокі. Кіроўца «Аўдзі» спрабаваў вывесці машыну ўправа, пасля чаго адбыўся занос. Машыну павяло, і яна крыху закранула «Рэно». Гэтага аказалася дастаткова для аварыі».

У ДАІ трымаюцца меркавання пра віну кіроўцы «Аўдзі». Заведзеная крымінальная справа. Яму пагражае ад 3 да 7 гадоў пазбаўлення волі.

**ВЖ**

### КАМЕНТАРЫ НА САЙЦЕ НН

#### «Адстрэльваць такіх ездзюкоў трэба»

**Асьвяк:** «Я б для такіх выпадкаў увёў у заканадаўства норму, каб вінаватага выдавалі б сваякам забітых, каб яны самі тварылі тое правасуддзе, якое палічаць патрэбным. За руль села безгаловае безадказнае пакаленне».

**Томас Асьвеяку:** «Дзікунствам на дзікунства?..»

**Wint:** «Кожны дзень бачыш, што абагнаць не даюць, нібы карона з галавы ўпадзе, наадварот, будуць ехаць па цэнтры дарогі і газку паддадуць, каб, абганяючы, пасівеў. Мне падаецца, што гэта адбываецца ад недахопу культуры, а хутчэй за ўсё — павагі да іншага».

**Зміцер:** «Адстрэльваць такіх ездзюкоў трэба...»

**Pleschengrad:** «Там амаль кожны тыдзень аварыя адбываецца: то фура перакуліцца, то машына ў лес вылеціць... А знак, які стаіць пасярод дарогі, збіваюць кожны дзень. Апошні месяц яго ўжо і ставіць перасталі. Як рабілі аб'ездавую дарогу вакол Плешчаніц, дрэнна спраектавалі развілку».

## Старшакласніца вербавала школьніц для порна

**Пракуратура Мінска распачала адразу дзесяць крымінальных справаў супраць 29-гадовага мінчука, які займаўся вырабам і распаўсюдам парнаграфіі.**

Гісторыя пачалася з затрымання вучаніцы 11 класа школы №167 Мінска. Яна пастаўляла 29-гадоваму мужчыну непаўналетніх і малалетніх дзяўчынак для здымак. Чарговая дзяўчынка, якую спрабавала завербаваць выпускніца, усё распавяла бацькам, а бацькі — супрацоўнікам Інспекцыі па справах непаўналетніх УУС Маскоўскага раёна.

Далей супрацоўнікі Маскоўскага УУС без цяжкасцяў знайшлі падпольную студыю дзіцячай парнаграфіі. Падчас вобшуку было знойдзена мноства дыскаў са знятымі матэрыяламі.

Знайшлі як мінімум восем непаўналетніх і малалетніх мінчанак, якія пацярпелі ад дзеянняў злачынцы. Заведзена 10 крымінальных справаў за распусныя дзеянні ў дачыненні непаўналетніх і загадзя малалетніх і іх згвалтаванне, уцягненне непаўналетніх у здзяйсненне злачынства, выраб і распаўсюд дзіцячага порна і іншыя.

Варта адзначыць, што апошнімі гадамі выяўленне злачынстваў, што падпадаюць пад артыкул 343 КК «Выраб і распаўсюд парнаграфічных матэрыялаў», значна пашырылася. На пачатку месяца «НН» пісала пра інцыдэнт у Гродне, калі мужчына разам з сяброўкай здымаў хатняе порнавідэа і выкладаў яго ў свой блог.

**ВЖ; інф. «Ежедневник»**

www.svaboda.org
100 адрасоў свабоды
Дзе павесіць шыльды ў гонар падзеяў найноўшай гісторыі Беларусі?
Вашы прапановы і адказы – штораніцы
07.00–08.00
больш чым радыё

### СЦІСЛА

#### Масавую бойку ўчынілі вулічныя байцы

30 жніўня каля Дома міласэрнасці ў Мінску адбылася масавая бойка з удзелам каля 80 чалавек. Міліцыя затрымала амаль усіх ўдзельнікаў інцыдэнту: 56 чалавек, у тым ліку 10 непаўналетніх. Са словаў затрыманых, пра месца і час бойкі яны дамовіліся папярэдне па тэлефоне. Прычыну таго, што здарылася, ніхто з іх тлумачыць не стаў. Проста хобі такое.

#### У Маскве загінуў беларус

Яшчэ трое працоўных з Беларусі пацярпелі. Абвалілася падзямельная паркоўка. Прычынай можа быць парушэнне тэхналогіі будаўніцтва.

#### Рабаўнік-таксіфіл

Ад 29 жніўня да 1 верасня ў сталіцы адбыліся 3 напады на таксістаў з мэтай рабунку. Па гарачых слядах затрымаць злачынцу не ўдалося. Падчас спецаперацыі міліцыя арыштавала раней судзімага жыхара Смалявічаў, якога падазраюць. Але пэўных доказаў пакуль не маюць.

#### У Пяршаях паранілі міліцыянта

Пракуратура Валожынскага раёна распачала справу за замах на забойства міліцыянта. Затрыманы жыхар вёскі Пяршаі. 2 верасня мясцовая жыхарка падчас спрэчкі з мужам звярнулася па дапамогу да ўчастковага. У міліцыянера быў выхадны, але ён з'явіўся на сямейны скандал у форме і са зброяй. У кватэры скандаліст накінуўся на інспектара і нанёс яму некалькі ўдараў нажом.

#### Беларусы рабуюць банкі ў Расіі

Міліцыя Маскоўскай вобласці ўстанавіла асобы падазраваных ва ўзброеным рабаванні, якое адбылося ў падмаскоўных Хімках. У чацвер удзень двое невядомых, узброеных пісталетам, уварваліся ў аперацыйную залу аддзялення Ашчадбанка і награблі торбу грошай. Падазраюцца двое грамадзян Беларусі.

**ВЖ**

# Расія страціць Каўказ

**Паўкрымінальнаму рэжыму Кадырава супрацьстаіць усё больш сумнеўны з маральнага гледзішча рух супраціву. Піша палітолаг Сяргей Богдан.**

Апошнім часам вайна ў Чачэніі і навакольных аўтаномных каўказскіх рэспубліках Расіі аднавілася з большай сілай.

Гэтым летам на Паўночным Каўказе штодня адбываліся перастрэлкі і выбухі. У чэрвені — сярэдзіне жніўня там былі забітыя 436 чалавек (за аналагічны перыяд 2008 года адпаведная лічба склала 150 асобаў). Колькасць атак вырасла з 265 да 452.

Вядома, расійскія ўлады не абвяшчаюць гэткай сумарнай статыстыкі — названыя лічбы сабраныя вашынгтонскім Цэнтрам стратэгічных і міжнародных даследаванняў з асобных інфармацыйных паведамленняў. Партызаны стралялі і ўзрывалі чыноўнікаў ды міліцыянтаў, у адказ улады ладзілі супрацьтэрарыстычныя аперацыі, а невядомыя выкрадалі і забівалі дысідэнтаў ды праваабаронцаў. Пасля колькігадовага перапынку ў Чачэнію вярнуліся і самазабойчыя замахі. Цягам тыдня тры групы баевікоў забілі сябе разам з мясцовымі міліцыянтамі.

### Незаменны Рамзан?

Дзеля таго, што вайна точыцца дзесяці далёка ад цэнтральнай часткі краіны, Крэмль можа не зважаць на абвастрэнне сітуацыі. У апошнія гады расійская стратэгія на Каўказе палягала ў стаўцы на Кадырава. Ён душыў паўстанне, а за гэта Масква дала яму рабіць усё, што ён лічыць патрэбным. Сам былы партызан, Рамзан Кадыраўператварыў у свой час колішні партызанскі аддзел у бязлітасную паліцэйскую сілу, якая займалася, паводле сабраных праваабаронцамі фактаў, катаваннямі і мардаваннямі ўсіх няўгодных. Цяперашні гаспадар Чачэніі сапраўды спыніў партызанскі рух у сваёй старане, але ў выніку паўстанне і партызанка перакінуліся на суседнія рэспублікі — Дагестан, Інгушэцію, Кабардына-Балкарыю, Карачаева-Чаркесію ды нават Адыгею. Пішучы пра пастаянныя тэракты ў сталіцы Дагестана Махачкале, журналісты пачалі ўжо параўноўваць яе з Багдадам.

Такая «перамога» Масквы хутчэй нагадвае паразу.

Цяпер аслабеў кадыраўскі кантроль і над самой Чачэніяй, а таму Крамлю мусова трэба вырашыць, ці працягваць ставіць на Кадырава, ці мяняць курс. Год таму, калі Кадыраў у чарговы раз запатрабаваў ад Масквы яшчэ большае аўтаноміі, Масква паспрабавала ўкараніць альтэрнатыўны варыянт кіравання праблемнымі каўказскімі рэспублікамі ў суседняй Інгушэціі.

### Падстаўлены Еўкураў

Тады адным з першых дзеянняў Мядзведзева на пасадзе прэзідэнта Расіі было знясце ўшчэнт дыскрэдытаванага тамтэйшага кіраўніка Зязікава (выпускніка Мінскай школы КДБ) ды прызначэнне наўзамен яму афіцэра ГРУ (вайсковай выведкі) Юнус-Бека Еўкурава. Еўкураў распачаў кампанію па заваёве папулярнасці, змагаючыся з карупцыяй і кантактуючы з дысідэнтамі і праваабаронцамі.

Аднак 22 чэрвеня ў выніку самазабойчага замаху на картэж Еўкурава інгушскага кіраўніка цяжка паранілі. Як зазначае на старонках «Нью-Ёрк таймс» каўказазнаўца з Маскоўскага цэнтра Карнэгі Аляксей Малашэнка, разам з тым зніклі надзеі, што Крэмль гатовы перайсці да выкарыстання мякчэйшага падыходу ў сваёй палітыцы ў рэгіёне. «Кожны, хто казаў, што трэба забіваць, душыць ды знішчаць, а дыялог непатрэбны — усе яны цяпер абгрунтоўваюць сваю пазіцыю лёсам Еўкурава».

На тым гвалт не скончыўся, і 17 жніўня грузавік з выбухоўкай уехаў у цэнтральны міліцэйскі пастарунак у найбуйнейшым інгушскім месце — Назрані, у выніку чаго загінула 25 чалавек, а яшчэ 280 былі параненыя.

Як заўжды, Кадыраў абвінаваціў вахабітаў і іншых рэлігійных экстрэмістаў у падрыхтоўцы атак і паўтарыў, што яны фінансуюцца і навучаюцца заходнімі краінамі.

Сапраўды, працей спісаць усё на падступных замежнікаў, чымся ліквідаваць глебу для канфлікту — праблемы ў сацыяльнай сферы: беднасць, беспрацоўе (узровень якога ў Чачэніі адзін з самых высокіх ва ўсёй РФ — 34%), кланавасць і карупцыю ва ўладзе.

Да таго ж, разгарнуўшы канфрантацыю з Грузіяй, Расія сама стварыла для каўказскіх партызанаў важнага хаўрусніка — Тбілісі, які ў нядаўнім мінулым ужо некалі дзейсна падтрымліваў чачэнскіх паўстанцаў.

### Фактычная незалежнасць сённяшняй Чачэніі

Кадыраў паціху становіцца праблемай для Расіі. У доўгатэрміновай перспектыве кіраваць Паўночным Каўказам так, як гэта робіць кіраўнік Чачэніі, немагчыма. Мала таго, што гэта раз'ядае сістэму дзяржкіравання ўсёй РФ, дык гэта проста не развязвае праблемы антырасійскага супраціву і рэлігійнага экстрэмізму, як паказалі цяперашнія атакі партызанаў.

Летняя актывізацыя паўстанцаў прывяла да таго, што




Кадыраўская Чачня прыняла сабе чырвона-зялёны сцяг з арнаментам.

Мядзведзеў стаў схіляцца да больш жорсткай тактыкі.

Пры канцы жніўня прэзідэнт РФ загадаў расійскім спецслужбам бязлітасна забіваць тэрарыстаў і заклікаў скасаваць суды прысяжных па справах аб тэрарызме. Маўляў, яны занадта часта заканчваюцца апраўданнямі абвінавачаных. Тым самым умацуецца кантроль урада над судовай галіной, а судовыя справы стане прасцей фабрыкаваць. Выкладаючы свой план паляпшэння сітуацыі на Каўказе, Мядзведзеў таксама прапанаваў замяніць мясцовыя кадры на Каўказе камандзіраванымі спецыялістамі з іншых рэгіёнаў РФ. Каментары пра наступствы такой палітыкі лішнія.

Абаронцы Кадырава кажуць, што змена маскоўскага курсу ў Чачэніі можа прывесці да трэцяй вайны.

**Распад Расіі застаецца імавернай перспектывай.**

### Чачня як Алжыр?

Масква ўсё больш падазрона ставіцца да Рамзана, а расійскія вайскоўцы і гэбісты былі раз'юшаныя рашэннем Кадырава аб супрацы з лідэрам незалежнікаў у выгнанні — Ахмедам Закаевым.

На старонках «Еженедельного журнала» Марк Фэйгін параўноўвае чачэнскую сітуацыю з выпадкам французскай калоніі Алжыра перад атрыманнем ёй незалежнасці. Ён зазначае, што насуперак усім перашкодам Кадыраў вядзе сваю рэспубліку да канчатковай юрыдычнай незалежнасці, ужо забяспечыўшы палітычную самастойнасць. Анягож, сёння Чачэнія фактычна не ёсць паўнавартаснай расійскай тэрыторыяй, бо расійскія законы тамака не дзейнічаюць, узброеныя аддзелы Кадырава федэральным ведамствам не падпарадкоўваюцца, адміністрацыя і суды функцыянуюць па-за агульнафедэральнай «вертыкаллю ўлады».

Іншае пытанне, што нармалёвай дзяржавы ў Чачэніі няма і ў бліжэйшы час наўрад ці з'явіцца, а існуе паўкрымінальны рэжым, якому супрацьстаіць усё больш сумнеўны з маральнага гледзішча рух супраціву.

Непазбежны закон палітыкі — чым болей доўжыцца вайна, тым больш галаварэзаў становіцца ў краіне і меншаюць шанцы на пабудову эфектыўнай праваой дзяржавы.

### Падтрымка Масквою бандытызму

Гэта заканамерны вынік маскоўскай палітыкі выцяснення з палітычнай арэны прыхільнікаў будаўніцтва ў Чачэніі свецкай нацыянальнай дзяржавы, кшталту Дудаева, Масхадава ці Закаева. Замест таго Крэмль падтрымліваў бандытызм у стылі Ямадаевых і Кадыравых, а рэжыму сям'і Кадыравых дазволена было існаваць па-за праўным полем.

Расійскае кіраўніцтва не ідзе, здавалася б, лагічным шляхам упарадкавання сістэмы дзяржаўнага кіравання Расіяй праз стварэнне федэрацыйнай сістэмы на падставе прынцыпаў законнасці і празрыстасці. Гэта азначала б неабходнасць перабудовы самога маскоўскага рэжыму, у якім зросліся інтарэсы крыміналу і гэбісцкіх структураў.

Наўзамен Крэмль усталёўвае поўны кантроль там, дзе гэта не вымагае значных высілкаў і дазваляе існаваць па-за ўсякім законам тэрыторыям, дзе гэта праблематычна.

Цікава, што такое мае месца ў гісторыі Расіі не ўпершыню. Яшчэ не скончыўшы заваёвы Каўказа, улады Расійскай Імперыі ў 1857 годзе таксама фактычна паставілі каўказскае насельніцтва па-за рамкамі дзеяння нармальнай сістэмы заканадаўства, скасаваўшы ў дачыненні да яго шэраг юрыдычных нормаў. Вынікам было не толькі існаванне асобнага рэгіёну ў рамках Імперыі, але і маргіналізацыя каўказскага насельніцтва, якое апынулася ў сваёй адасобленай рэзервацыі. Іншым традыцыйным аспектам расійскай палітыкі ўціхамірвання Каўказа былі велізарныя субсідыі. Аднак няясна, ці спрыяюць яны лаяльнасці насельніцтва ў дачыненні да Масквы, бо невядома, якая іх частка сапраўды даходзіць да насельніцтва, а якая раскрадаецца і прысабечваецца мясцовымі і федэральнымі чыноўнікамі.

Выйсцем з каўказскіх праблемаў Расіі было б стварэнне сапраўднай эфектыўнай федэрацыйнай дзяржавы.

Але дзеля таго расійскай палітычнай эліце неабходна адмовіцца ад цяперашняй палітычнай культуры дый цалкам перабудаваць дзяржсістэму, абсалютысцкія прынцыпы якой былі закладзеныя яшчэ Пятром I Шалёным. Гэта немагчыма, бо ніхто не пагодзіцца руйнаваць саму аснову свайго жыцця і светапогляду — марныя ў гэтым сэнсе былі некалі спробы Ельцына лібералізаваць Расію. Нашы ўсходнія суседзі працягваюць капаць самім сабе магілу.

**Сяргей Богдан**

* * *

Загаловак ад Рэдакцыі. Аўтарскі загаловак: «Вайна ў Чачні аднавілася».

# Трэцяя авіякатастрофа ў гісторыі незалежнай Беларусі

**З моманту крушэння беларускага Су–27 у Радаме мінула больш за тыдзень. Здарэнне, расследаванне якога засакрэчана, абрастае новымі версіямі.**

### Чаму не спрацавала катапульта?

Адразу звярнула на сябе ўвагу тое, як хутка зрэагавала Міністэрства абароны на катастрофу. Праз некалькі гадзін пасля трагедыі яно паведаміла, што імаверная прычына здарэння — трапляньне птушкі ў паветразаборнік. І што пілоты вырашылі не катапультавацца, а адвесці самалёт як мага далей ад населенага пункта. То бок яны фактычна адразу былі прызнаныя героямі, якія выратавалі людзей у польскім горадзе. Пакуль гэтая версія не абвяргалася. Пазней у распараджэнні СМІ і грамадскасці аказаўся відэазапіс здарэння і запіс апошняй размовы пілотаў і дыспетчара.

Як адзначылі многія, на відэазапісе палёту бачна, што пілоты ўсё-такі спрабавалі пакінуць самалёт, але, напэўна, не спрацавала катапультнае крэсла. На відэа можна заўважыць толькі скід шклення кабіны.

### Неліцэнзаваная мадэрнізацыя?

У інтэрв'ю «Известиям» расійская кампанія «Сухой» назвала сваю версію катастрофы. Паводле меркавання экспертаў, прычына ў няправільнай працы авіяцыйнага бартавога абсталявання машыны. Як паведаміла выданню яе крыніца, на відэазапісе выразна бачна, як пасля выканання фігуры вышэйшага пілатажу пілот спрабуе ўключыць фарсаж (набор максімальнай хуткасці). «На нейкі момант дым з рухавікоў стаў гусцейшым, але пасля стаў больш бледным за звычайны. Машыне не хапіла цягі, і яна ўпала на зямлю», — падсумоўвае эксперт. У «Сухім» лічаць, што «прычына заканамерная, бо Беларусь даўно займаецца няўзгодненай з кампаніяй мадэрнізацыяй авіятэхнікі з разлікам на купцоў у краінах трэцяга свету».

> **Версія «Сухога»: «Прычына заканамерная, бо Беларусь даўно займаецца няўзгодненай з кампаніяй мадэрнізацыяй авіятэхнікі для перапродажу ў трэці свет».**

Мінабароны Беларусі на момант з'яўлення той публікацыі не запрашала экспертаў кампаніі прыняць удзел у расследаванні трагедыі.

### Дэфіцыт налёту

У польскіх СМІ большасць выказвалася на карысць чалавечага фактару як прычыны здарэння. Маўляў, пілоты і кіраўніцтва беларускіх Ваенна-паветраных войскаў, спрабуючы ўразіць заходнюю публіку, пераацанілі свае сілы.

У інтэрв'ю польскім журналістам эксперт па справах авіяцыі Станіслаў Бжэг-Велуньскі адзначыў, што, магчыма, ва ўсім вінавата слабая падрыхтаванасць беларускіх пілотаў. Паводле стандартаў NATO, яны маюць маленькі налёт гадзін. Гэта пацвярджаецца і дадзенымі, якія агучыла Мінабароны: у палкоўніка Марфіцкага 2500 гадзін налёту, а ў Жураўлевіча — каля 1600. Марфіцкі, які пачынаў лятаць у 1978 годзе, за гэты час, паводле еўрапейскіх стандартаў, павінен быў правесці як мінімум 5000 гадзін у небе.



Аляксандр Жураўлевіч (злева) і Аляксандр Марфіцкі.

**Аляксандр Марфіцкі**

нарадзіўся 16 мая 1956 у пасёлку Багушэўск Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. У 1978 скончыў Харкаўскае вышэйшае вайсковае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў, у 1987 — Вайскова-паветраную акадэмію імя Гагарына, у 2002 — Акадэмію кіравання пры прэзідэнце Беларусі. Апошняя пасада — намеснік камандуючага Заходнім аператыўна-тактычным камандаваннем ВПС і войскаў СПА. Раней камандаваў 61-й знішчальнай авіяцыйнай базай у Баранавічах. Налёт — прыблізна 2500 гадзін.

**Аляксандр Жураўлевіч**

нарадзіўся 28 мая 1963 у вёсцы Крэмава Міхайлаўскага раёна Прыморскага краю Расіі. Адукацыя — Чарнігаўскае вышэйшае вайсковае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў (1984). Апошняя пасада — намеснік камандзіра 61-й знішчальнай авіябазы. Налёт — больш за 1600 гадзін. Абодва пілоты жылі ў Баранавічах. У Аляксандра Жураўлевіча засталіся дачка і жонка, у Аляксандра Марфіцкага — жонка і дзве дачкі.

### Тэорыя змовы

Яшчэ адной версіяй стала магчымая дыверсія беларускіх лётчыкаў. Такое меркаванне на сайце нашай газеты выказаў ананімны карыстальнік, які, мяркуючы па ўсім, добра разбіраецца ў авіятэхніцы. Ён піша, што першы выступ беларускіх вайсковых пілотаў у краіне NATO павінен быў стаць пэўным геапалітычным сігналам.

Паводле яго меркавання, пілоты спрабавалі катапультавацца, але катапультная сістэма не спрацавала. На яго думку, зламыснікі разлічвалі на гучную аварыю, якая паўплывала б на грамадскую думку Польшчы.

### Гісторыя катастроф

Першая катастрофа ў гісторыі арміі незалежнай Беларусі таксама звязана са знішчальнікам Су-27.

Яна адбылася ў маі 1996 года падчас вучэбнага палёту і прывяла да смерці лётчыка Уладзіміра Карвата. Пасля ўзгарання ў левым абцякальніку хваставой часткі лётчык звязаўся з зямлёй і атрымаў каманду пакінуць машыну. Але ён у гэты час знаходзіўся над населенымі пунктамі Арабаўшчына і Вялікае Гацішча і таму паспрабаваў адвесці самалёт. У выніку знішчальнік упаў у полі, а лётчык загінуў. Яму пасмяротна прысвоілі званне «Герой Беларусі».

Меней вядома пра другую авіякатастрофу. Яна адбылася праз год пасля першай — у маі 1997. Разбіўся знішчальнік-бамбардзіроўшчык Су-17, а Сяргей Паграбан (таксама з Баранавіч, як Марфіцкі і Жураўлевіч), які ім кіраваў, загінуў.

> **Паводле стандартаў NATO, налёт гадзін Марфіцкага і Жураўлевіча — мізэрны.**

У ліпені гэтага года маёр запасу ВПС з Ліды Георгій Бухтарэвіч апублікаваў у сваім ЖЖ адкрыты ліст Аляксандру Лукашэнку. У ім ён паскардзіўся на стан, у якім знаходзіцца вайсковая авіяцыя. У лісце Бухтарэвіч прыгадаў выпадак, калі ў маі 2005 года падчас параду звяно МіГ-29, якое спазнілася, ледзь не сутыкнулася са штурмавіком Су-25. Але таму здарэнню кіраўніцтва ВПС таксама не дало агалоскі.

Некаторыя прадстаўнікі беларускай інтэрнэт-супольнасці звязалі сёлетнюю катастрофу Су-27 з гэтым лістом — маўляў, сумныя наступствы, пра якія казаў маёр Бухтарэвіч, сталі трагічнай рэальнасцю.

Калі афіцыйнай прычынай крушэння Су-27 у Радаме будзе прызнаны тэхнічны стан самалёта ці памылка пілотаў, гэта ўдарыць па іміджы беларускай арміі.

**ВЖ**

## «Катапультуйся! Катапультуйся!!!»

**Расшыфроўка перамоваў беларускіх лётчыкаў з дыспетчарамі ў Радаме.**

**Лётчыкі:** Мяжу якую даюць?

**Дыспетчар:** Арыенціровачна 1300–1400 метраў. Мусіць хапіць, я думаю.

**Лётчыкі:** Будзем, калі што, шукаць дзірачку... Скажаш пасля, у які бок. Ну, у нас яшчэ пятля ўзыходная падвойная. Таму падкажаш. Мо крыху ў правы бок ад паласы давядзецца, вось як цяпер. Бачыш, дзірка над паласой?

**Дыспетчар:** Запускайцеся.

**Лётчык:** Выконваю.

**Дыспетчар:** Мяжа арыенціровачна 1400-1500. Дзесьці ў вышым раёне, паглядзіце, крыху вышэй пакет ляціць чорны. Метраў 50 вышыня ў яго. Да цэнтра паласы падлятае.

Больш уважліва. 103-ы передаў [параду]. Перад узлётам супакоіліся — і як дома...

Будзе сустрэчны ўвесь час... Будзе зносіць вас ад трыбун назад, таму пасля фігур удакладняйцеся...

**Лётчык:** Зразумеў (узляцелі).

* * *

**Дыспетчар:** Давайце, на 150 выводзьце акуратненька... Гэта вывад? Лінія. Вывад!

Вывад!!! Куды рухаешся? Куды рухаешся? Катапультуйся! Катапультуйся!!!!

* * *

Сёмы Вежа, Ратавальнік сто сорак сёмы, Вежа, СУ-27 разбіўся.

**Расшыфроўку выканала Еўрапейскае радыё для Беларусі**

## Радыёаматару, які запісаў апошнія перамовы, пагражае два гады турмы

Ім цяпер займаецца польская пракуратура.

Запіс апошніх словаў пілотаў Су-27 з'явіўся ў інтэрнэце літаральна праз некалькі гадзін пасля трагедыі на адным з польскіх форумаў. Пасля мадэратары запіс выдалілі, але ён ужо паспеў трапіць у блогі і на тэлебачанне.

Вайсковая пракуратура ў Варшаве, якая праводзіць расследаванне аварыі, устанавіла, што запіс зрабіў радыёаматар з Радама. Мужчына падслухоўваў Вежу пры дапамозе сканера без дазволу. Згодна з крымінальным кодэксам Польшчы, гэта з'яўляецца злачынствам.

Пакуль не паведамляецца, ці заведзеная крымінальная справа ў дачыненні да гэтага чалавека.

«Паколькі такія паводзіны павінны разглядацца праз прызму злачынства, згаданага ў артыкуле 267 §3 КК Польшчы, а выканаўца быў чалавекам цывільным, справа будзе перададзена ў раённую пракуратуру ў Радаме», — сказаў палкоўнік Ірэнеуш Шэлянг, намеснік вайсковага пракурора Польшчы.

У гэтым артыкуле гаворыцца, што «чалавек, які, не маючы на тое паўнамоцтваў, атрымлівае інфармацыю, не прызначаную для яго, адкрывае запячатаны ліст, падлучаецца да кабеля для праслухоўвання або парушае электронныя, магнітныя ці іншыя асаблівасці захавання бяспекі інфармацыі, можа быць пакараны ў выглядзе абмежавання волі або турэмнага зняволення тэрмінам да двух гадоў». Гэта азначае, што радыёаматару пагражае пакаранне за змяшчэнне інфармацыі ў інтэрнэце.

# На «Міс Мінск» адмяняюць мадэльныя параметры

**Ад выхаду ў купальніках аднак не адмовіліся, бо «мужчыны не даруюць».**

Фінал конкурсу «Міс Мінск-2009» пройдзе 10 верасня ў спорткомплексе Мінск-Арэна. Сёлетні конкурс мае адрозненні ад мінулагодніх. Па-першае, пашырылі ўзроставыя рамкі для канкурсантак. Гэта дзяўчаты ад 18 да 30, хаця трыццацігадовых і няма сярод удзельніц. У асноўным на кастынг прыходзілі дзяўчаты 18—21 гадоў.

Былі прыбраны таксама і мадэльныя абмежаванні.

«Мы надта стаміліся ад конкурсаў прыгажосці з такімі мадэльнымі параметрамі, бо кожны раз прыходзяць адны і тыя дзяўчаты. Я сама назіраю іх гадамі. Конкурс прыгажосці — гэта шоу, якое павінна кожны раз набываць новыя формы», — адзначыла дырэктар Нацыянальнай школы прыгажосці Вольга Сярожнікава.

Падчас конкурсу пройдзе дэфіле ўдзельніц. Арганізатары абяцаюць прыгожыя касцюмы, над якімі працуюць беларускія дызайнеры. Будзе таксама выхад дзяўчат у купальніках. Ад яго хацелі адмовіцца. «Але мужчыны не даруюць нам, калі гэтага не будзе», — пажартавала Вольга Сярожнікава.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Дырэктарка Нацыянальнай школы прыгажосці Вольга Сярожнікава і сама магла б у конкурсе паўдзельнічаць.**

«Міс Мінск» вызначыць журы. У яго ўключаны чатыры народныя артысты: два з Беларусі — Анатоль Ярмоленка, Аляксандр Ціхановіч і два з Расіі — Ігар Нікалаеў, Аляксандр Сяроў. Падчас конкурсу яны дадуць невялікі канцэрт.

Асобна будзе ўручаны прыз глядацкіх сімпатый.

Пераможцу чакае грашовы прыз і дапамога ў рэалізацыі свайго сацыяльнага праекту.

Арганізоўваюць конкурс Мінгарвыканкам, тэлеканал СТБ і Нацыянальная школа прыгажосці.

**Сяргей Макарэвіч, фота Юліі Дарашкевіч**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Здароўе былога мэра сталіцы Паўлава пагоршала

**Яго чакае новая аперацыя.**

Нагадаем, што ў красавіку Паўлаву зрабілі аперацыю па выдаленні пухліны галаўнога мозга. Нейкі час стан здароўя чыноўніка ацэньваўся як стабільна цяжкі. Пасля мэр прайшоў курс рэабілітацыі ў Нямеччыне.

Ад пасады старшыні Мінскага гарвыканкама Міхаіл Паўлаў быў вызвалены 10 чэрвеня ўказам Аляксандра Лукашэнкі.

Пакуль медыкі адмаўляюцца ад каментароў і прагнозаў, але хутчэй за ўсё Міхаіла Паўлава чакае паўторная аперацыя.

**«Ежедневник»**

# Афіцыйны сайт РБ: цяпер і па-беларуску




Высвятляецца, у нашай краіны ёсць афіцыйны сайт Belarus.by, і як выявілася, ён дагэтуль не размаўляў па-беларуску. Нядаўна стваральнікі старонкі вырашылі выправіць гэтую прыкрасць, і з 4 верасня Belarus.by займела белмоўную версію.

Дагэтуль ахвочыя маглі прачытаць пра нашую краіну адно па-англійску і па-расійску.

Сайт прызначаны найперш для замежнікаў і змяшчае інфармацыю пра турыстычныя славутасці (у тым ліку даведкі пра візавы рэжым і страхоўкі), гісторыю, культуру, а таксама звесткі пра эканамічны патэнцыял, бізнэс-магчымасці. На сайце ёсць стужка дзяржаўных навінаў і фотаздымкі.

Belarus.by быў створаны лукашэнкаўскім агенцтвам БЕЛТА.

**ВЖ, ЛК**



# Кадафі-мабіль

**Бацька лівійскага народа спраектаваў самы бяспечны ў свеце аўтамабіль.**

Вы чулі пра палкоўніка Муамара Кадафі, які 40 гадоў адзінаасобна кіруе Лівіяй? Дык вось, гэты кіраўнік у вольны ад працы час яшчэ паспявае думаць пра падушкі бяспекі, краш-тэсты і да таго падобныя рэчы, цішком распрацоўваючы safety-сістэмы для легкавых аўтамабіляў. У стольным Трыпалі прэзентавалі шырокай публіцы аўто з гучнай назвай «Ракета Рэспублікі», назваўшы яго «самай бяспечнай машынай у свеце».

«Ракета Рэспублікі» мае форму гоначнага кацера, каштуе блізу 2 мільёнаў даляраў і была пабудаваная за грошы таго ж Кадафі італьянскай фірмай «Тэска ТС».

Гэтымі днямі Лівія з шыкам святкуе 40-ю гадавіну прыходу Кадафі да ўлады. Урад дэманструе дасягненні Джамахірыі — лівійскае «дзяржавы для народа». Маючы вялізныя даходы ад нафты, Кадафі скарыстоўвае іх на заваёву папулярнасці. Ён часта дзейнічае насуперак нормам, прынятым на Захадзе. Падчас дзяржаўных візітаў спіць у бедуінскім шатры. Ахоўваць сябе наняў жанчынаў. А для прыцягнення ўвагі да лівійскай магутнасці нават ладзіў тэракты ў Еўропе. Толькі пасля атакі ЗША на Ірак ён трохі папалохаўся і аціх, нават адмовіўся ад распрацоўкі атамнай бомбы. Знайшоў сабе больш мірнае хобі.

**ЛК, паводле ВВС**

# Як часта спецслужбы праслухоўваюць тэлефоны і пранікаюць у кватэры?

Судовы дэпартамент пры Вярхоўным судзе Расіі абнародаваў матэрыялы, многія з якіх раней ішлі пад грыфам «сакрэтна», піша «Российская газета». Згодна з гэтымі матэрыяламі, у 2009 годзе расійскія спецслужбы амаль 115 тыс. разоў ускрывалі з дазволу суда чужыя лісты і больш за 11 тыс. разоў пранікалі ў кватэры грамадзян — як правіла, патаемна. Акрамя таго, больш за 64 тыс. разоў суды дазвалялі ставіць тэлефоны на праслухоўванне.

Газета адзначае, што спецслужбы сталі крыху часцей прасіць падобныя дазволы, а суды ў адказ павялічылі колькасць адмоваў.

У Беларусі такія звесткі застаюцца сакрэтнымі.

**МБ**

## СЦІСЛА

### Каменная Горка будзе самым вялікім раёнам Мінска

Тут маюць збудаваць амаль 2 млн кв.м жытла. Архітэктары разбілі ансамбль на пяць мікрараёнаў. Упрыгожыць кварталы купа 9- і 18-павярховых дамоў, узведзеных па індывідуальных праектах.

Дамы ўзводзяцца групамі. У дварах паўстануць дзіцячыя пляцоўкі, месцы адпачынку. Машыны можна будзе паркаваць па перыметры кожнага квартала, а не ў дварах.

Пасярод праляжа зялёная зона ў форме падковы. У ёй прапішуцца школы (па плане 11), садкі (18), спартпляцоўкі. Будзе там і кірмаш, басейн, кінатэатр, рэстаран, культурны цэнтр.

### Севярынец: зайчыху прыйшлося адпусціць

Навіна пра тое, што палітык **Павал Севярынец (на фота)** рукамі злавіў на Гомельшчыне зайчыху, шмат каго пацешыла. Аліса — менавіта так назвалі зайчыху — пасялілася ў тэлефоннай будцы ў двары бабулі палітыка. Але, як распавёў сам Павал Севярынец, зайчыху прыйшлося адпусціць: «Побач з яе новым жытлом праводзіліся будаўнічыя працы, жыць там для зайчыхі стала некамфортна. Таму мы падлячылі яе і выпусцілі на волю».



### Гарадзенец здаваў на правы 73 разы

Штодзённа ў экзаменацыйным класе ДАІ збіраецца па 250 курсантаў, пры гэтым 200 з іх прыходзяць на пераздачу.

Кожны год у Гродне знаходзіцца чалавек, які экзаменуецца ад 30 да 50 разоў. А адзін 35-гадовы гарадзенец наведваў прыёмную камісію ДАІ 73 разы! Увогуле ж, па статыстыцы палова гарадзенцаў здаюць на правы з пятага разу.

Часта людзі і ўмеюць кіраваць машынай, ды моцна нервуюцца. Вось і збіваюцца, асабліва жанчыны.

**МБ; БЕЛТА; ЯМ**

## Чаму беларусы не перасаджваюцца на ровары

**Германія перажывае раваровы бум.** Паводле часопіса Deutschland, летась немцы набылі 4,5 млн веласіпедаў. Эканомія грошай, бясплатны фітнэс — вось козыры педальнага транспарту, піша часопіс. Агулам у Нямеччыне цяпер 68 млн веласіпедаў — у 80% сем'яў ёсць як мінімум адзін ровар.

Самае галоўнае, немцы актыўна перасоўваюцца на роварах у гарадах. Кожны, хто быў у Берліне, бачыў, колькі людзей там перасоўваюцца на двух колах. А ў гарадках сярэдняга памеру — яшчэ больш.

Веласіпеднай сталіцай Еўропы з'яўляецца нямецкі Мюнстэр. Пры колькасці жыхароў 270 тысяч тут каля 700 тысяч веласіпедаў.

У сувымерным жа яму Брэсце няма пакуль нават інфраструктуры для веласіпеда.

Тратуар нідзе не падзелены для пешаходаў і раварыстаў. Жахліва гарбатыя, калі ёсць, з'езды з бардзюраў. Закрайкі вуліц, якімі звычайна кіруюцца веласіпедысты, часта калдобістыя. Небяспека так і лунае ў паветры. У выніку за 2008 год у Брэсцкай вобласці загінула 20 веласіпедыстаў, 75 атрымалі траўмы.

Ёсць усяго кіламетраў з дваццаць неблагой месцамі веладарожкі ўздоўж трасы Брэст—Кобрын, і не больш. А каб былі зручныя даезды роварамі скрозь — больш народу наважылася б перасесці на вела.

Пакуль жа людзі ездзяць хай сабе і на драндулетах, але чатырохколавых. У Брэсцкай вобласці, паводле статыстыкі абласной ДАІ, кожны сёмы аўтамабіль старэйшы за 20 гадоў. Асноўны масіў прыватнага аўтапарка старэйшы за 10 гадоў. А ў Злучаных Штатах, прыкладам, аўто старэйшае за 10 гадоў лічаць даспелым для прэса на звалцы металалому — бо яго абслугоўваць нерэнтабельна.

А ровар — гэта ж так рэнтабельна. Гэта інвестыцыя ў здароўе.

**Яўген Бяласін, Інга Абрамава, Брэст**

## Раздушыць наркагандаль, як раздушылі рабаўніцтва на трасах

**Магчыма, Лукашэнку варта заняцца праблемай наркагандлю так, як у свой час ён заняўся праблемай рабаўніцтваў на трасах.**

Тут і Паўлічэнку з'явіцца куды прыткнуць, і Захад слова ўпоперак не скажа, і рэйтынг электаральны падрасце.

А яшчэ прапаную вярнуцца да крымінальнага пераследу за спажыванне, але толькі ў тым разе, калі спажывец адмаўляецца здаць прадаўца.

**Цукар**

## Як праводзіць святы ў Бычках?

Наколькі большы эфект ад Быкаўскага свята ў Бычках быў бы! Каб толькі арганізатары вытрацілі час і бензін і загадзя занеслі ў кожную хату ў Бычках і вялікім суседнім мястэчку Кублічы запрашэнні на яго.

Каб напісалі, што прыедуць Барадулін і Арлоў, і спевакі. А так — грошы на давоз людзей з Мінска знайшлі. Грошы на прэмію знайшлі. Грошы на пачастунак знайшлі. А ўсё — у сваім коле. Хто сам сабой ад выканкамаўскага свята застаўся, той пабачыў і наша, свабоднае свята. Выканкамаўскія каўбаскі добрыя былі. А ж і свабоднае свята было прасветлым.

Мы столькі энергіі ўкладаем у нашы імпрэзы. Трэба часам з розумам дадаць трошкі яшчэ — і эфект будзе рэзанансны. Усё мае сэнс, што выходзіць вонкі нашага ўнутранага кола. Што прабіваецца ў публічную прастору, тое і варта.

**Сяргей Недубавец**

## Мы — краіна-ўтрыманка

Беларусь выглядае нібы той алкаголік, які не саромеецца штодня прасіць грошы ў свайго суседа. Піша наш чытач з Ліды **Валер Нехвядовіч**.

Ці можа Беларусь зрабіцца падобнай да Паўночнай Карэі? Не. Бо прыйшлося б пераняць ідэалогію чучхэ. А гэта ж ідэалогія разліку толькі на сябе.

Паўночная Карэя — гэта крайнасць. Яна робіць балістычныя ракеты і палохае сваіх суседзяў. Беларусь жа, не робячы нічога асабліва карыснага ці кепскага для сваіх суседзяў, бясконца лямантуе, каб на яе не забываліся, і пад гэты лямант несправядліва пакрыўджанай кабеты клянчыць грошы і розныя прэферэнцыі ўсюды, дзе толькі можна іх выклянчыць.

Прычым на гэтай зямлі клянчаць амаль усе, незалежна ад палітычных схільнасцяў.

Лукашэнка ўжо больш за тузін гадоў клянчыць у Расіі. Цяпер, трохі пасварыўшыся з ёю, пачаў клянчыць на Захадзе.

Апазіцыйныя лідэры не адстаюць.

Лявон Баршчэўскі збіраецца прасіць эканамічнай дапамогі ў Еўрасаюзе. Пытанне ж наконт таго, ці павінна Еўропа ўвогуле быць фундатарам Беларусі, спадаром Баршчэўскім не ставіцца, бо адказ яму вядомы загадзя: «Павінна!»

Анатоль Лябедзька крычыць пра няправільныя паводзіны Еўропы: мала грошай на справы апазіцыі дае, а без яе грошай дэмакратыі ў Беларусі быць не можа.

Зянон Пазняк кажа, што пасля малочнага канфлікту ўсім, нават савецкім

Супрацоўніцтва ў сучасным беларускім разуменні — і лукашэнкаўцаў, і апазіцыі — гэта калі іншыя краіны даюць крэдыты або прэферэнцыі.

беларусам, стала зразумела: Расія заўсёды трымалася і трымаецца толькі імперска-захопніцкага тыпу палітыкі, і дадае, што гэтай сваркай павінен скарыстацца Еўрасаюз. Лукашэнку патрэбны грошы, і Еўрасаюз, прапануючы яму крэдыты ды інвестыцыі (з іншых месцаў дапамогі Лукашэнка цяперашнім часам не дачакаецца), мусіць высунуць тры ўмовы: 1) забеспячэнне абароны беларускае культуры; 2) вызваленне Аўтуховіча і іншых палітвязняў, а таксама спыненне палітычнага пераследу грамадзян; 3) правядзенне свабодных пазачарговых выбараў прэзідэнта і парламента.

Асабіста я падпісваюся пад усімі патрабаваннямі спадара Пазняка. Але ж такая пазіцыя, на жаль, усё роўна клянчанне: маўляў, мы самі не здольныя, таму, паважаныя еўрапейцы, ратуйце нас.

Супрацоўніцтва ў беларускім разуменні — гэта калі іншыя краіны ці міждзяржаўныя аб'яднанні даюць нам нейкія прэферэнцыі і крэдыты. «Дайце, дайце! А не дасце, то праклянём».

Мы — краіна-ўтрыманка, якая робіць выгляд, што жыве на свае, але крый Божа, каб нехта звярнуў на гэта нашу ўвагу, мы адразу пачнём трэсціся ў істэрыцы і называць яго паганым ворагам.

Еўропа доўгі час гадавала самадастатковую і вольную асобу, якая нічога не клянчыць у іншай асобы, а дамаўляецца з ёю, сыходзячы з роўнасці іх правоў у дыялогу. Гэтак жа будуюцца дачыненні паміж еўрапейскімі дзяржавамі А Беларусь выглядае нібы той алкаголік, якому так выпіць хочацца, што ён не саромеецца штодня прасіць грошы ў свайго суседа.

І вось алкаш, набраўшы грошай, адпраўляецца ў запой. Сусед яго доўга не бачыць, а калі сустракае, то з агідай кажа: «Я ўжо думаў, што ты сканаў». А той, з тлумнай галавой і дурнымі вачыма, ізноў просіць на апахмелку. Пасля наступнага запою алкаш да суседа не прыходзіць, затое прыходзіць ягоная жонка… І цяпер ужо сусед перакульвае чарку. Тады другую, трэцюю, і ўсё. Бо на памінках болей не п'юць.

## Берасцейскі помнік. Рыскі над «у»

**У вас была нататка «Вітаўт, Радзівіл Чорны і князь Васількавіч» пра новы помнік у Берасці.** Дык вось, на бронзавых надпісах таго помніка зрабілі аж 75 арфаграфічных памылак. Адлілі на вякі! Усе літары «ў» там — чамусьці без рысачак. Проста «у». У той час як «й» з рысачкай . Відаць, бронзы бракавала. Або культуры.

**Антон Гаўрылін, Брэст**

**Ад Рэдакцыі.** Пачнем з таго, што ва ўмовах татальнага ідэалагічнага кантролю цяжка чакаць з'яўлення вартых твораў мастацтва. Што вы хочаце, калі скульптар задумаў паставіць Божую Маці, а праваслаўная царква кажа: не, гэта пярэчыць нашым традыцыям. Стаўце анёла замест Божай Маці. Гэта зніштажае сам прынцып творчае цэласнасці, незалежнасці мастацкае думкі.

А ўсё ж важна ўжо тое, што ўлады маюць ахвоту пакідаць па нашым часе помнікі. Наступны помнік можа стаць лепшы.

Што да помніка Берасцю, то многія звяртаюць увагу, як недарэчна яго размясцілі. Ён нібы ўпіраецца ў суседнія дрэвы, яго глушаць будынкі побач. На яго лепей глядзець з пэўнай адлегласці, а на рагу Савецкай і Гогаля яму бракуе перспектывы. Памылка лакалізацыі горшая ад арфаграфічных, бо зводзіць на нішто ўсе эстэтычныя вартасці цікавага ў сваёй задуме манумента. Ёсць думка, што намнога лепш ён глядзеўся б на месцы цяперашняга помніка Леніну. Давайце рабіць так, каб ён як найхутчэй і заняў гэтае месца. Памылкі ж мясцовая ўлада, як мы ведаем, абяцае паправіць.

## Наш Грунвальд у Дудутках

**Яшчэ ў 1410 годзе ля невялікага мястэчка Грунвальд, што зараз знаходзіцца ў Польшчы, адбылася адна з самых вялікіх бітваў Сярэднявечча.** Перамаглі ў ёй нашы продкі. Рэканструкцыю гэтых падзей, а таксама шматлікія турніры можна было пабачыць 18 і 19 ліпеня на тэрыторыі этнаграфічнага комплекса «Дудуткі».

Удзельнічалі такія рыцарскія клубы як «Секерж», «Белы тур», «Русіч», «Ордэн паўночнага храма», «Алтын Тумен», «Княжы гуф» і іншыя.

У перапынку са сцэны слых усіх прысутных лашчылі тры дзяўчыны з гурта «Расалія». Пастановачныя баі паказалі два сярэднявечныя тэатры: «Берсерк» і «Камандорыі Ордэна паўночнага храма».

Пасля паўзы, падчас якой можна было падмацавацца сырам і маслам мясцовай вытворчасці, пачалася кульмінацыйная падзея першага дня — рэканструкцыя Грунвальдскай сечы. Як і 600 гадоў таму, войскі доўга не пачыналі, але вось літвінскае войска рушыла на праціўніка. Пасля ў яе ўступіла і польскае рыцарства, але хутка было абкружанае часткай войска пад даводствам магістра Тэўтонаў, і толькі тылавы ўдар Вітаўта выратаваў і пераламіў ход бітвы. Перамога!

Другі дзень пачаўся традыцыйна з турніру лучнікаў.

Пасля адбыліся масавыя бойкі рыцарскіх клубаў — бугурты, выступіў танцавальны гурт «Філамея». Скончыўся ж фестываль вялікім канцэртам з удзелам гуртоў Кейлі Кёл, Пераплуты, Cornu Copia, «Стары Ольса» і «Літвінтроль».

Такім чынам, адбыўся першы фестываль славы беларускай зброі, і гэта было цудоўна!

**Яўген Зубовіч, Мінск**



# Крыжы на месцы расстрэлу Лапіцкага

1 верасня грамадскасць Вілейкі паставіла крыжы на месцы расстрэлу Расціслава Лапіцкага — героя змагання за незалежнасць Беларусі.

Справу прымеркавалі на дзень нараджэння Лапіцкага. Крыжы паўсталі ля вёскі Красны Беражок.

Нагадаем, на гэтым месцы год таму грамадскасць Вілейкі паставіла памятны камень, але праз нейкі час вандалы, прысланыя, імаверна, уладамі, яго знішчылі.

Ва ўсталяванні крыжоў бралі ўдзел 30 прадстаўнікоў ад Вілейкі, Маладзечна, Смаргоні, Салігорска і Мінска. Адзін крыж паставілі ў памяць аб Лапіцкім, а другі — аб усіх ахвярах савецкіх рэпрэсіяў. Крыжы вырабілі прадстаўнікі Беларускай хрысціянскай дэмакратыі.

Перед прысутнымі выступіў старшыня Вілейскай суполкі Партыі БНФ і рэдактар газеты «Волат» Аляксей Сюдак. Ён сказаў, што ў планах — зрабіць у гэтым месцы мемарыял памяці героям барацьбы за незалежнасць — тым, чые магілы акупанты наўмысна хавалі.

Сп.Аляксей зазначыў: «Няма ўпэўненасці, што гэтыя крыжы не знішчаць. Але актывісты будуць іх аднаўляць штораз, як гэта рабілі літоўцы на Гары крыжоў».

Помнік Лапіцкаму збурылі сёлета перад Радаўніцай, потайкі. Ён стаяў на месцы расстрэлу патрыёта. Помнік — камень з мемарыяльным надпісам — вілейская грамада паставіла ўвосень 2008 года. Яго асвяціў праваслаўны святар з вёскі Касута, адкуль быў родам і сам Лапіцкі, і дзе ягоны бацька служыў праваслаўным святаром.

Надпіс на камені казаў: «У гэтым месцы расстраляны РАСЦІСЛАЎ ЛАПІЦКІ (1.IX.1928 — 28.X.1950), Змагар за незалежнасць Беларусі». Валун стаяў на бетоннай падушцы, быў вагою некалькі тон, злучаўся з бетонам металічнымі прутамі.

**Алесь Звон, Вілейка**

**Лапіцкі з сябрамі**

стварылі антысавецкую падпольную арганізацыю, якая ў 1948—1949 гадах распаўсюджвала ўлёткі. Яна пратрымалася некалькі гадоў, пакуль на яе след не выйшлі савецкія спецслужбы. У 1950 годзе група была раскрытая. Допыты, катаванні — і прысуд. Група ставіла сваёй задачай дабіцца незалежнасці Беларусі, што разглядалася савецкім рэжымам як асаблівае злачынства. Удзельнікаў адправілі гніць у канцлагеры, а кіраўнікі — Расціслаў Лапіцкі ды Факунда Несцяровіч — былі асуджаныя на расстрэл. Несцяровіч напісаў прашэнне аб памілаванні, і расстрэл яму замянілі зняволеннем. Расціслаў пісаць прашэнне адмовіўся. Яго расстралялі ва ўрочышчы Красны Беражок ля Вілейкі. Было яму тады 22 гады.

У Мінску яшчэ жыве родная сястра Лапіцкага Вольга, у Касуце захавалася хатка Лапіцкіх. Больш пра Расціслава Лапіцкага ў кнізе: Міхась Чарняўскі. Як пошуг маланкі. — Мінск: Тэхналогія, 2006.

## Бяруць крэдыты, а хто вяртаць будзе?

**Сёння лукашысты просяць у свету, каб далі грошай, даклад-ней, долараў.** Хто іх будзе вяртаць? Нашы ўнукі, праўнукі. А я гэтага не жадаю.

Нашаму галоўнаму начальніку трэба было з першых дзён сваёй работы ехаць у Германію, Францыю, ЗША і вучыцца, як кіраваць і рабіць. У

Нашаму галоўнаму начальніку трэба было з першых дзён сваёй работы ехаць у Германію і вучыцца, як кіраваць і рабіць.

Германіі сёння ў 12 разоў узровень жыцця вышэйшы за наш. Вось вам і вынік, як трэба працаваць, а не штрафы даваць і забараняць.

**Анастас Семяновіч, Бараўляны (Мінскі раён)**

## Гаварыце ж на сваёй мове!

**Часам у інтэрв'ю прыстойнага, сумленнага чалавека можна пачуць, што ён размаўляе на сваёй мове, але ідзе ў краму альбо ў якую дзяржаўную ўстанову, то пераходзіць на расійскую для зручнасці кантакту, каб яго правільна зразумелі.**

Такая двудушнасць вельмі дорага абыходзіцца інтарэсам нашай Бацькаўшчыны, бо такі чалавек робіцца публічным носьбітам ідэі ўнутранай акупацыі Радзімы шляхам русіфікацыі.

Публічнае звяртанне на роднай мове ва ўстановах — гэта кожнаму даступны, лёгкі, пачэсны, дзейсны і выніковы шлях у змаганні за незалежнасць Бацькаўшчыны супраць унутранай акупацыі.

**Мікалай Куксо, Івянец (Валожынскі раён)**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**




# Айцец нацыянальнай ідэі паўстаў у бронзе

6 верасня ў Смаргоні прайшоў XVI Дзень беларускага пісьменства. У свята было дзве кульмінацыі — асвячэнне храма Праабражэння Гасподняга і адкрыццё помніка Францішку Багушэвічу.

Помнік Багушэвічу паўстаў на ўскрайку парку. Аўтары скульптуры — Леў і Сяргей Гумілеўскія. Чатырохметровая фігура пісьменніка стаіць абапёртая на камень. У руцэ — кніга. На помніку высечаны словы класіка: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!»

Беларуская мова ў гэты дзень гучала і з вуснаў многіх чыноўнікаў. Па-беларуску прамаўлялі віцэ-прэм’ер Уладзімір Патупчык, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Ігар Жук. Па-беларуску гаварыў і пасол Украіны ў нашай краіне Ігар Ліхавы. Ягоная прысутнасць была вытлумачальнай. Багушэвіч пасля разгрому паўстання Каліноўскага хаваўся і вучыўся ў Нежыне, што пад Чарнігавам. А ідэя пісаць на роднай мове прыйшла да яго пад уплывам украінскага нацыянальнага руху: калі Шаўчэнка змог ствараць шэдэўры на сваёй гаворцы, дык чаму не я? Калі ўкраінцы прэтэндуюць на палітычную ўладу ў сваё краіне, дык чаму не мы?

Дзень беларускага пісьменства праходзіць па чарзе ў кожнай вобласці ў першую нядзелю верасня. Раней Дзень пісьменства прымалі Пінск, Полацк, Камянец, Паставы, Барысаў. У наступным годзе свята пройдзе ў Хойніках Гомельскай вобласці.

**Сяргей Макарэвіч**

## (Амаль) уся праўда пра Літву

Пад сціплай сідзішнай вокладкай хаваецца цэлая краіна.

Цікава, цікава, і што там у дзяржаве, да якой ад нас 0 кіламетраў...

Спярша начэпім ружовыя акуляры. Дасціпны неаадраджэнскі комікс пра адрасы і шыльды беларускай Меккі. Для настальгуючых па ідэі «Няіхняй Вільні» — прачулы аповед віленчука-беларуса. Потым акуляры рэзкім рухам здымаецца, і мы знаёмімся з Літвой вачыма саміх літоўцаў. Тут і vox populi — замалёўкі з віленскага рынку «Кальварыя», і vox intellectuali — пазнавальная відэа-выправа па віленскіх вулках з заходам на не менш віленскія завулкі і завугольлі.

Яшчэ на дыску Litouskaja Pravda — інтэрв’ю з бацькам самага галоўнага рэд-хот-чылі-перца Энтані Кідзіса, літоўца з паходжання. Пацешыць спажыўца таксама спіс-агляд культавых бараў і клубаў Вільні.




**За 169 км ад Мінска пачынаецца іншая рэальнасць.**

Плюс цэлая калекцыя яскравай літоўскай музыкі і складанка відэакліпаў.

Хоць мультымедыйная кружэлка атрымалася вільня- і багемацэнтрычная, але, акрамя стоціса, сакоціса і Сабоніса, нашых ведаў у літвазнаўстве істотна папалела.

**Лявон К**

## Поўныя «Навінкі»



Перформанс — гэта свайго роду спектакль. Мастацкі акт, які здзяйсняе сам творца. Там, на ўлонні прыроды, артысты далі сабе волю.

**Сёлета на беларускі фестываль перформансаў «Навінкі» з’ехаліся 34 акторы з Беларусі, Іспаніі, Швецыі, Фінляндыі, Аўстрыі, Польшчы і іншых краінаў. Закрыццё фестывалю традыцыйна адбылося на возеры Вяча, што пад Мінскам.**

## Барды пратапталі «Вішнёвы сад»

Упершыню на адным полі сустрэліся гранды расійскай аўтарскай песні і беларускай традыцыі кабарэ.

4—6 верасня ў сядзібе «Вішнёвы сад» вёскі Шаткава, што на Бабруйшчыне, прайшоў бардаўскі фестываль «Культурная эвалюцыя».

У ім узялі ўдзел вядомыя госці з Расіі: літаратурны крытык Леў Анінскі, выканаўца Сяргей Нікіцін. У той жа час запрасілі і людзей, значных у культуры беларускамоўнай песні: Алеся Камоцкага, паэта, аўтара і выканаўцу; музычнага журналіста Надзею Кудрэйку, якая шмат гадоў вяла на беларускім радыё праграму аб аўтарскай песні «Мая музыка». На жаль, дождж і нестыкоўкі ўнеслі свае карэктывы ў фестываль. Не прыехала зорка беларускага кабарэ Зміцер Вайцюшкевіч. Не ўдалося паказаць і знакавы спектакль «Камедыя» паводле Марашэўскага і Аляхновіча. А выступленні прыйшлося з поля перанесці ў фае гатэля і вялікі вайсковы намёт.

Затое ў канцы быў закладзены сапраўдны вішнёвы садок з дзесяці дрэваў.

**СМ**

## Свежы «Дзеяслоў»




**У нумары Марыя Лукашук з Брэста горача дыскутуе з Сяргеем Дубаўцом і Альгердам Бахарэвічам. Яна бароніць ад іх кнігу Севярынца «Люблю Беларусь».**

Чарговы нумар адкрывае проза Леаніда Дранько-Майсюка. Вядомы як лірык, ён ужо не першы год выступае на старонках часопіса з апавяданнямі, а вершы з’яўляюцца рэдка. Затое з паэтычнымі нізкамі выступілі Людміла Рублеўская і Уладзімір Арлоў, якіх чытач ведае за гістарычную прозу. Хаця сп.Арлоў даўнавата не радаваў новымі аповесцямі.

Да 1000-годдзя Літвы друкуецца «Аповесць пра Войшалка» ў перакладзе Івана Саверчанкі, пра Войшалка піша і гісторык Алесь Краўцэвіч.

«Дзеяслоў» знаёміць чытача з творамі пераможцаў літаратурнага конкурсу памяці Карласа Шэрмана.

Свае творы друкуюць таксама Франц Сіўко, Паліна Качаткова, Дар’я Ліс.

**СМ**

## Гісторыя народжаных пад Сатурнам

Іх было ўсяго некалькі дзясяткаў — юнакоў, пасланых урадам раскіданай, але не зломленай Беларускай Народнай Рэспублікі, на чэхаславацкую зямлю вучыцца. «Куфэрак Віленшчыны» адкрывае цудоўны раман аднаго з тых студэнтаў.

Яны ехалі ў Прагу з самых розных куткоў падзеленай на кавалкі Беларусі, марачы, што ў дасягненні будучай незалежнасці будзе частка і іх справаў. На жаль, везлі маладыя беларускія студэнты з сабою ў сталіцу Чэхаславаччыны і свае класавыя і сацыяльныя забабоны, партыйны падзел, міжканфесійную варожасць. Многіх зацягвала таксама шумнае і бесклапотнае жыццё вялікага еўрапейскага горада, і праз год ці два ад мараў аб вяртанні на Беларусь заставалася толькі іронія.

«Хто выйдзе пракокам з нашага пражскага Назарэта? Я думаю — ніхто. Большасць з нас пакладзе свае косці на чужыне, меншасць будзе саромеца апрануцца ў бацькаў кажух, бо ён смярдзіць. Так пройдзем мы, пражане, па свеце, як пыл, — не нацешыўшы нікога ні сваім роскветам, ні сваёй моцай», — кажа адзін з герояў рамана.




**Віктар Вальтар. Выбраныя творы.** Мінск: «Кнігазбор», 2009. 280 с.

І ўсё ж такі многія вярталіся. Варта згадаць выдатныя імёны лірыка Уладзіміра Жылкі, дэпутата Сойма Ігната Дварчаніна, інжынера Адольфа Клімовіча... У 1926 годзе, змучаны сухотамі, так і не атрымаўшы дыплома інжынера, вярнуўся ў Дзвінск і Віктар Вальтар. Рэшту свайго кароткага 28-гадовага жыцця ён працаваў у беларускім школьніцтве ў Латвіі і пісаў сваіх «Роджаных пад Сатурнам» — першы раман аб беларускіх эмігрантах.

Аднак «Роджаныя пад Сатурнам» — раман не толькі і не столькі аб жыцці беларускай супольнасці ў Чэхаславаччыне, хаця большасць яго герояў маюць свае гістарычныя прататыпы. Гэта раман аб пакутлівым жыццёвым выбары аднаго чалавека, безнадзейна ад яго нацыянальнасці і сацыяльнага паходжання. Тугоўскі, галоўны герой рамана, задае сабе пытанне: «А нашто я жыву на свеце?» і цягам усяго твора спрабуе вырвацца з таго зачараванага кола, якое ён сам сабе стварыў гэтым пытаннем. Іншыя беларускія студэнты вучацца, мараць вярнуцца на Радзіму ці проста пражываюць жыццё ў пражскіх кавярнях і рэстаранах, Тугоўскі ж сваімі падзеннямі і ўзлётамі выклікае ў чытача перш-наперш здзіўленне і непрыязнасць. Праўда, чытаючы далей, усё больш і больш бачыш у ім часцінку самога сябе і паступова перастаеш судзіць яго так строга.

«Роджаныя пад Сатурнам» — раман аб «беларускіх ластаўках», якіх захапіла ў свае моцныя абдымкі чужына і якія пасля толькі ў снах спакойнымі пражскімі ранкамі маглі бачыць высокі бераг Нёмана і чуць плёскат вады, што абмывала іх у залацістыя сонечныя дні іхняй вясны.

З творчасцю ўраджэнца Латгаліі, студэнта-«пражаніна» Віктара Вальтара, знаёміць нас чарговая, трынаццатая па ліку, кніга бібліятэкі маладзечанскага часопіса «Куфэрак Віленшчыны».

На вокладцы тома, руплівa складзенага Сяргеем Панізнікам і Міхасём Казлоўскім, у тумане восеньскага ранку бачна старажытная Прага, якую чытач агледае праз акаліцу замкавай вежы. Той самай Прагі, якой блукаюць цені народжаных пад Сатурнам, герояў галоўнага твора Віктара Вальтара.

**Андрэй Вашкевіч, Гродна**

# Досвед непаразуменняў

Што перашкаджае беларусам супрацоўнічаць? Піша **Алег Дзярновіч**.

З нагоды кніжкі:

**Алег Гардзіенка. Беларускі кангрэсавы камітэт Амерыкі (БККА).** — Смаленск, 2009. — 428 с., [12] с. іл. (БІНІМ, Бібліятэка Бацькаўшчыны; кн. 16).

Гэта кніга пра стваральную дзейнасць і адаптацыю людзей да новых умоваў жыцця. Але яе матэрыял дае магчымасць паразважаць над адной важнай праблемай — фенаменальнай няздольнасцю беларусаў да каардынацыі дзейнасці.

Кніжка распавядае пра хвалю беларускай эміграцыі, якая пасля Другой сусветнай вайны апынулася на Захадзе. Найбольш масавай была працоўная эміграцыя канца XIX — пачатку XX стст. Тады Беларусь пакідалі сацыяльна неўладкаваныя пласты грамадства. Эміграцыя ж 1944 г., перад прыходам савецкіх войскаў, была палітычная. Гэтую хвалю адрознівае выразны антыкамунізм. Але палітычна актыўныя беларусы апынуліся безнадзейна падзеленымі яшчэ ў лагерах для перамешчаных асобаў у паваеннай Нямеччыне.

### Два палітычныя цэнтры

Пасля перыяду тактычнай паўзы (афіцыйна ў лагерах перамешчаных асобаў палітычная дзейнасць была забароненая) розныя групоўкі беларускіх дзеячаў рэанімавалі дзве кіроўныя структуры.

Радаслаў Астроўскі зноў публічна стаў на чале Беларускай Цэнтральнай Рады, утворанай у снежні 1943 г. у Мінску як дарадчы орган пры нямецкай адміністрацыі.

Мікола Абрамчык рэанімаваў праект Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

У часе вайны Рада БНР не была звязаная з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі, бо ўвогуле ніяк не выяўляла сваёй дзейнасці. Для яе лідэраў гэта было добрым аргументам у кантактах з заходнімі саюзнікамі. Але Мікола Абрамчык быў не дужа вядомы ў асяроддзі ўцекачоў. Ён не займаў ніякіх пасадаў у акупаванай немцамі Беларусі. У 1920-я Абрамчык вучыўся ў Празе і там зблізіўся з дзеячамі БНР.

Сярод беларускай грамадскасці пашыралася інфармацыя, што апошні старшыня Рады БНР Васіль Захарка перад смерцю ў Празе ў сакавіку 1943 г. перадаў Міколу Абрамчыку паўнамоцтвы старшыні Рады БНР, а Ларысе Геніюш — на захаванне архіў і сімволіку БНР. Савецкія спецслужбы менавіта па гэтым пункце мелі найбольшую цікавасць да Геніюш — ім карцела атрымаць архіў. Інфармацыя пра пераемнасць у справах БНР дазволіла Абрамчыку ўзначаліць аднаўленую Раду.

Так на арэну выйшлі два цэнтры палітычнай рэпрэзентацыі беларусаў.

Як піша А.Гардзіенка, пачалася барацьба за ўплыў на дзясяткі тысяч уцекачоў паміж «старым» лідэрам Астроўскім і «новым» — Абрамчыкам. Гэтая барацьба на дзесяцігоддзі перадвызначыла будучыню беларускай эміграцыі па ўсім свеце. Абодва бакі абрынуліся са знішчальнай крытыкай на апанентаў.

Тыя, хто падтрымліваў Астроўскага, закідалі Абрамчыку супрацоўніцтва з Ватыканам. «Бэцээраўцы» нават падазравалі, што Апостальскі пасад дае грошы на Раду БНР. Таксама яны падкрэслівалі, што Захарка быў па сутнасці прыватнай асобаю, а Урад БНР перадаў свае паўнамоцтвы бальшавікам з БССР у 1925 г. і самаліквідаваўся.

У адказ у 1947—1948 гг. пачалася кампанія дыскрэдытацыі «астроўшчыкаў». БЦР і асабіста Астроўскага вінавацілі ў супрацоўніцтве з нацыстамі.

А.Гардзіенка заўважае, што падобныя закіды рабілі, у тым ліку, актывісты БЦР, якія самі бралі актыўны ўдзел у грамадскім і вайсковым жыцці акупаванай Беларусі: Барыс



Сціплы інжынер Мікола Абрамчык аднавіў Раду БНР.

Рагуля, Аўген Калубовіч, Станіслаў Станкевіч, Франц Кушаль.

Але і паплечнікам Астроўскага было што сказаць — яны вінавацілі Абрамчыка, а таксама Калубовіча, Кушаля ды іншых у супрацоўніцтве з польскімі і савецкімі спецслужбамі ў 1920—1930-я. Фантасмагорыя сітуацыі ўзмацнялася тым, што Астроўскі ў міжваенны час сам быў савецкім агентам ды займаўся адмываннем грошай ОГПУ (тады так называлася КДБ) для беларускіх арганізацый у Заходняй Беларусі.

### Зноў пра саманазву

Першы істотны раскол у эміграцыйнай грамадзе адбыўся праз спрэчку, як называцца. Ваду замуцілі інтэлектуалы.

Як адзначае даследчык Ян Максімюк, самую радыкальную версію для сярэдзіны XX ст. сфармулявалі Янка Станкевіч і Антон Адамовіч — яны прапанавалі адрадзіць старую этнічную назву *крывічы* і адпаведна *Крывія, крывіцкі*. Прапанова атрымала прыхільны водгук сярод часткі інтэлігенцыі з Заходняй Беларусі і актыўна прапагандавалася ў лагерах для перамешчаных асоб. У шмат якіх дакументах і выданнях таго перыяду словы *крывіч, Крывія* выступалі замест словаў *беларус, Беларусь*.

Большасць эмігрантаў негатыўна паставілася да гэтай ініцыятывы. Многія баяліся, што калі іх дзеці атрымаюць школьныя дакументы з адпаведнай назваю, гэта выкліча ў афіцыйных інстанцыях пытанне пра іх сапраўдную нацыянальнасць. У выніку, ад «крывіцкай» ідэі выраша на было адмовіцца, але назва «крывічы» стала трывала атаясамлівацца з прыхільнікамі Рады БНР.

### Царкоўны падзел

Вострым стаў і царкоўны раскол сярод праваслаўных беларусаў.

У жніўні 1942 г. у Мінску адбыўся Царкоўны сабор, скліканы пад ціскам беларускіх дзеячаў і пры падтрымцы нямецкай адміністрацыі. Сабор пастанавіў стварыць Беларускую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву (БАПЦ).

Пасля вайны ў Заходняй Нямеччыне разам з перамешчанымі асобамі апынуліся і шасцёра епіскапаў БПЦ. І яны, не паінфармаваўшы паству, склалі просьбу прыняць іх з вернікамі ва ўлонне Расійскай Замежнай Праваслаўнай Царквы (РЗПЦ). Епіскапы пайшлі на такі крок, бо расійская эміграцыя была багацейшая, а таму абяцала лепшае ўтрыманне духоўнікам. Самі ж епіскапы тлумачылі яго патрэбаю «ў часовых зносінах у малітвах» з расійскай царкоўнай структурай да часу атрымання аўтакефаліі.

Запратэставала інтэлігенцыя, асабліва «крывічы», якія ў 1945—1946 гг. вялі рэй у



За расколам незалежніцкіх беларускіх палітычных сілаў мог стаяць савецкі агент Кім Філбі.

арганізацыйным і культурным жыцці беларускай эміграцыі. Сярод іх было шмат каталікоў, і епіскапы скарысталі гэты факт ў прапагандысцкай вайне: маўляў, хочуць навярнуць беларусаў-праваслаўных ва ўніяцтва і падпарадкаваць Ватыкану.

> Фантасмагорыя сітуацыі ўзмацнялася тым, што Астроўскі ў міжваенны час адмываў грошы ОГПУ для заходнебеларускіх арганізацый.

Але ж быў варыянт пазбегнуць царкоўнага расколу. Працягвала дзейнічаць Польская Праваслаўная Царква, у юрысдыкцыю якой да пачатку Другой сусветнай вайны ўваходзілі прыходы ў Заходняй Беларусі. Да таго ж мітрапаліт Пінскі Аляксандр не прызнаў далучэння да РЗПЦ. Мітрапаліт ППЦ Дзяніс у свой час ускладу на Аляксандра апеку над Віленскай, Пінскай і Гродзенскай епархіямі БАПЦ. Але здарылася горшае. 9 лютага 1948 г. ён загінуў пры загадкавых абставінах — у Мюнхене яго папросту скінулі з лесвіцы. Юрыдычна законны і псіхалагічна прымальны для ўсіх плыняў эміграцыі аб'яднаўчы царкоўны праект быў пахаваны.

Царкоўныя ды іншыя супярэчнасці адштурхнулі ад грамадскай актыўнасці вялікую



Радаслаў Астроўскі заблытаўся ў сувязях са спецслужбамі СССР, Германіі і Брытаніі.

колькасць эмігрантаў, якія не жадалі браць удзелу ў спрэчках.

### Канспіралагічная версія

Наколькі канфлікты ўнутры нацыянальных рухаў правакуюцца варожымі спецслужбамі, а наколькі вынікаюць са спецыфічных нацыянальных глыбінь? Відавочна, што савецкая агентура не была зацікаўленая ў кансалідацыі беларускай эміграцыі. Быццам бы нейкія пацвярджэнні таму маем.

Да актывізацыі дзейнасці Астроўскага спрычыніўся шэф 9-га аддзела Брытанскай сакрэтнай службы (Secret Intelligence Service) Кім Філбі. Ужо потым на Захадзе стане вядома, што Філбі ад 1933 г. быў савецкім агентам.

У 1940-х усур'ёз разглядаліся варыянты перарастання «халоднай вайны» ў гарачую. У такім разе Захаду была б патрэбная прадстаўнічая фігура для Беларусі. А Астроўскі быў больш вядомы тут, чым Абрамчык. У Філбі, такім чынам, з'явіліся аргументы на карысць Астроўскага. Менавіта калі Філбі пачаў супрацоўнічаць з Астроўскім, той стаў праводзіць свае палітычныя акцыі адкрыта.

Эмігрант Кастусь Мярляк адзначаў з гэтай нагоды: «...калі злачынная дзейнасць шэфа англійскай сакрэтнай службы Кіма Філбі была раскрытая ў 1955 годзе, абодва прэзідэнты — Астроўскі і Абрамчык — не стараліся для дабра беларускага народа ліквідаваць падзел беларусаў, а наадварот, падзел пашыралі і распальвалі варожасць між людзьмі. Варожасць, выкліканая падзелам, працягвалася ў дзеянні і контрдзеянні ва ўсіх галінах грамадскага жыцця на працягу трох дзесяткаў гадоў і нанесла аграмадную шкоду беларускай нацыянальнай справе».

### Псіхасаматычная версія

Пры ўсёй дзейснасці таемных метадаў супраць беларусаў аперацыі спецслужбаў траплялі на падрыхтаваную глебу.

Найноўшая беларуская свядомасць сфармаваная ў некамфортных умовах. Многія натуральныя рэчы: самаідэнтыфікацыя і нават публічнае карыстанне беларускай мовай звязанае ў беларусаў з непаразуменнем, а то і моцным процідзеяннем знешняга асяроддзя. Усё гэта прымушае беларусаў да вялікай унутранай працы і фармавання цвёрдай уласнай пазіцыі. А гэта ўжо добрая магчымасць для з'яўлення дагматызму. Любы іншы погляд у такой сітуацыі можа быць непрымальным ды выклікаць раздражненне. Такім чынам, людзям з базава блізкімі поглядамі вельмі цяжка дамовіцца паміж сабой, а супрацоўніцтва робіцца немагчымым.

Прымем пакуль гэтую версію за працоўную гіпотэзу...




# Свята горада па-альтэрнатыўнаму

Пасля «Навальніцы» прыспеў час «Камяніцы».

Для тых, хто не жадае **ў суботу 12 верасня** адзначаць свята горада сярод бетонных будынкаў і гарадскога тлуму, ёсць альтэрнатыва. Пасля «Навальніцы» прыспеў час «Камяніцы» — прадстаўнічага фольк-фэстывалю пад Мінскам. Якіх **пяць кіламетраў ад мікрараёна Малінаўка, на тэрыторыі Музея народнай архітэктуры і побыту**, больш вядомага як Строчыцы, на вольным паветры сярод старых хат і млыноў адбудзецца выступ гуртоў **«Крыві»**, **«Стары Ольса»**, **«Нагуаль»**, **«Джамбібум»**, **«Гаротніца»** ды іншых.

«Верасень і фолк — браты-блізняты, — кажа Вераніка Круглова, лідэрка «Крыві». — Хаця на «Камяніцы» мы зайграем у джаз-рокавым гучанні: з бубнам і басам. Гэта будзе своеасаблівая анталогія: створаныя «Крыві» новыя і старыя песні. Так што ўсіх сардэчна запрашаю 12-га верасня на фолк-фэст у Строчыцы!» Канцэрт дабрачынны: усе грошы ад продажу білетаў пойдуць на рахунак музея. Кошт — 6300 руб. (дарослы квіток), 3200 руб. (дзіцячы). **Пачатак а 15-й.**

**ЛК**

## КАНЦЭРТЫ

**Kriwi**

**У тэатры эстрады (вул.Маскоўская, 18а) 19 верасня** — «Kriwi». **Пачатак а 19-й.**

**Рокаш**

**У клубе «Графіці» (зав. Калініна, 16) 19 верасня а 19-й** — канцэрт «Рокаш'у» і «Rosy».

**Разбітае сэрца пацана**

**14 верасня тамсама** выступае гурт з кардэбалетам «Разбітае сэрца пацана». **Пачатак а 19-й.**

**Neuro Dubel**

**У «Графіці» 20 верасня** — канцэрт «Neuro Dubel». **Пачатак а 19-й.**

**Крама**

**18 верасня ў «Графіці»** — канцэрт «Крамы». **Пачатак а 19-й.**

**Тэатр габрэйскай песні «Сімха»**

**У Малой зале філармоніі імя Р.Шырмы (пр.Незалежнасці, 50) 13 верасня** выступае тэатр габрэйскай песні «Сімха». **Пачатак а 16-й.**

**Дзень барабанаў**

**У Вялікай зале Філармоніі 14 верасня** — дзень барабанаў і перкусіі: «Grig Percussion» запрашае сяброў». **Пачатак а 19-й.**

## ІМПРЭЗЫ

**Уладзімір Арлоў на ТБМ**

Прэзентацыя новай кнігі паэзіі Уладзіміра Арлова адбудзецца **ў мінскай сядзібе ТБМ (вул.Румянцава, 13) 21 верасня. Пачатак а 18-й.** Уваход вольны.

**Прэзентацыя дыска Міколы Ермаловіча**

**11 верасня ў Палацы мастацтваў (вул.Казлова, 3, канферэнц-зала)** пройдзе прэзентацыя дыска «Мікола Ермаловіч. Лісты. Выступы. Гутаркі. Вершы». Тэксты на дыску чытае Валер Мазынскі. Выдавец — «БелТонМедыя». Таксама прэзентуецца кніга Паўла Савоські «Апошні сезон». Бяруць удзел: Андрэй Федарэнка, Валянцін Акудовіч, Барыс Пятровіч, Уладзімір Арлоў, Міхась Башура, Алесь Кваткевіч, Валер Мазынскі. Музычны выступ: FolkRoll і Наста Някрасава. **Пачатак а 18-й.**

**Другі фронт мастацтваў**

**12 верасня** выдавецтва «Галіяфы» ладзіць у межах фестывалю «Дах-9» прэзэнтацыю выданняў серыі «Другі фронт мастацтваў». Гэта кнігі Віктара Іванова «Асарці», Святланы Кухарэвіч, Алеся Папова «Шчыра. Ня шчыра». Бяруць удзел: Вера Бурлак, Віктар Жыбуль, Георгій Барташ, Людміла Рублеўская, Наталля Кучмель, Віка Трэнас, Наталля Пушкарова, Зміцер Вішнёў, Аксана Спрынчан, Яраш Малішэўскі, Павал Кузіч. **Пачатак а 18-й.**

**Пятровіч, Акулін, Дранько-Майсюк**

**16 верасня ў канферэнцзале Палаца мастацтваў** пройдзе прэзэнтацыя кніг Барыса Пятровіча «Пілілікі», Эдуарда Акуліна «Вітражы» і Леаніда Дранько-Майсюка «Анёлак і я». Бяруць удзел: Уладзімір Арлоў, Уладзімір Някляеў, Міхась Скобла, Анатоль Вярцінскі, Генадзь Бураўкін, Андрэй Хадановіч, Алесь Камоцкі. Вядзе імпрэзу Віктар Шалкевіч.

**Грэка-каталіцкі клуб інтэлігенцыі**

Грэка-каталіцкі клуб інтэлігенцыі імя св. Кірыла Тураўскага праводзіць першае пасяджэнне пасля летняга перапынку. **У пятніцу 18 верасня ў 19.00** даклад на тэму «Мінскі грэка-каталіцкі джанат на працягу стагоддзяў» прачытае архітэктар А. Яроменка. Пасяджэнне адбудзецца **ў Грэка-каталіцкім цэнтры Св.Язэпа (вул. Арджанікідзэ, 6)**. Даезд: ст. метро «Аўтазаводская», выхад у бок аптэкі, перайсці скрыжаванні з вуліцамі Чалюскінцаў і Украінскай.

**Што з шоу-бізнэсам?**

**13 верасня** «Ліберальны клуб» запрашае ўсіх ахвотных далучыцца да дыскусіі на тэму «Беларускі шоу-бізнэс: рэальнасць і перспектывы». Удзел бяруць прадусары і выканаўцы. Дыскусія адбудзецца **ў Міжнародным адукацыйным цэнтры (пр. газеты «Праўда», 11). Пачатак у 15.30.**

## ВЫСТАВЫ

**Заходняя Беларусь у мастацтве**

**У Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20) ад 17 верасня да 19 кастрычніка** працуе выстава «Заходняя Беларусь у мастацтве», прымеркаваная да 70-годдзя аб'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі. **Адкрыццё выставы адбудзецца 17 верасня, а 17-й.**

**Мінск. Крыху іншы погляд...**

**У галерэі «Ў» (к-р «Беларусь») да 3 кастрычніка** працуе фотавыстава «Мінск. Крыху іншы погляд». Нечаканасць многіх ракурсаў разам з задуманай стылізацыяй змушае іначай зірнуць на знаёмы горад.

**Дачная калекцыя**

**У галерэі «Славутасць» (вул.Багдановіча, 21, 2-гі паверх) да 21 верасня** працуе «Дачная калекцыя» Аляксандра Кудраўцава, мастака па мастацкай апрацоўцы металу. Наведнікі змогуць убачыць падсвечнікі, камінныя прылады, цікавыя сувеніры, каваныя і зварныя.

**Калекцыя бацікаў Вадзіма Удавенкі**

**У галерэі «Славутыя майстры» (Камунальная ўзбярэжная, 4) да 30 верасня** працуе выстава калекцыі бацікаў Вадзіма Удавенкі.

**Новыя вобразы: выстава сучаснага кітайскага жывапісу тушшу**

**У Мінскім гістарычным музеі (вул.Маркса, 12) да 29 верасня** працуе выстава сучаснага кітайскага жывапісу тушшу «Новыя вобразы», на якой дэманструюцца працы 22 аўтараў. Прадстаўлены пейзажы, жанравыя кампазіцыі.

**«Белыя вароны» і «Дэбют 5»**

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасці, 47) да 26 верасня** працуе выстава мастацага лямцу «Белыя вароны» і выстава аўтарскіх лялек «Дэбют 5».

**Сюжэты і вобразы Рафаэля ў гравюры**

**У Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20) да 5 кастрычніка** працуе выстава «Сюжэты і вобразы Рафаэля ў гравюры».

**Арт Авантаж**

**У галерэі «Універсітэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) з 11 да 26 верасня** працуе выстава «Арт Авантаж», на якой будзе магчымасць зірнуць на моду як на састыні тэатр эмоцыяў, дзе кожная дэталь і элемент маюць сваё ўласнае значэнне…

## ФУТБОЛ

**Беларусь—Украіна**

**9 верасня на стадыёне «Дынама»** пройдзе адборачны матч да Чэмпіянату свету паміж нацыянальнымі зборнымі Беларусі і Украіны. **Пачатак а 20-й.** Квіткі ад 15 да 50 тыс. рублёў

## ТЭАТРЫ

**«Тэатральны куфар-2009»**

Міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў пройдзе сёлета **28 верасня — 3 кастрычніка.** У фестывалі прымуць удзел студэнцкія тэатры 16 краінаў свету. Сярод якіх Тэатр культурнай асацыяцыі Doua El-Ghad з Алжыра са спектаклем «Назад — Хаджа Бін Юсуф», Іранскі ўніверсітэцкі тэатральны дом (Sayeh theatre) паставіць «Паэзію жыцця манекенаў» (М.Машхур), Незалежная тэатральная кампанія і Універсітэт Заходняй Англіі UWE з п'есай «Шкада, што яна шлюха» (Дж.Форд) і іншыя.

Беларусь будзе прадстаўлена студэнцкімі калектывамі «На балконе» (Народны студэнцкі драматычны тэатр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта г.Мінск) са спектаклем «Зімы не будзе» (В.Альшанскі), «На філфаку» (Народная музычная тэатр-студыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта г. Мінск) са спектаклем «F1» (І.Мурэнка), а таксама «Люстэрка» (Незалежная тэатр-студыя) пакажа п'есу «Салдацікі» (А. Жарабцова).

Яшчэ два беларускія ўдзельнікі пакуль знаходзяцца ў рэзерве: калі нехта з замежных прадстаўнікоў не прыедзе, то гледачы пазнаёмяцца з тэатральнымі групамі «ARTvoyage» (Студэнцкі тэатр-студыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі) і «Дыханне» (Народны маладзёжны тэатр-студыя Мінскага Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў). Яны рыхтуюць для гледачоў спектаклі «Трэці інгрэдыент» (О.Генры) і «Што наша жыццё…» («Прапанова», «Спатканне», «Страшная ноч» А.П. Чэхава). Традыцыйна ўсе спектаклі пройдуць на сцэнах беларускіх універсітэтаў.

**НШ**

**10 верасня**

**Тэатр імя Горкага** — «Я твая нявеста»

**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»

**Музычны тэатр** — «Шклянка вады»

**11 верасня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»

**Музычны тэатр** — «Дон Жуан у Севільі»

**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»

**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»

**12 верасня**

**Купалаўскі тэатр** — «Памінальная малітва»

**Тэатр імя Горкага** — «Валянцінаў дзень»

**13 верасня**

**Музычны тэатр** — «Айбаліт-2002»

**Купалаўскі тэатр** — «Афрыка»

**Музычны тэатр** — «Прынцэса цырка»

**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з дурнем»

**Тэатр імя Горкага** — «Даходнае месца»

**14 верасня**

**Купалаўскі тэатр** — «Дзеці Ванюшына»

**15 верасня**

**Купалаўскі тэатр** — «Больш чым дождж»

**Музычны тэатр** — «Ноч у Венецыі»

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адвечная песня»

**16 верасня**

**Купалаўскі тэатр** — «Беларусь у фантастычных апавяданнях»

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Нязваны госць»

**Музычны тэатр** — «Рускі фантом»

**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»

**Тэатр оперы і балета** — «Рамэа і Джульета»

# «Рок па вакацыях» перанесены на 2 кастрычніка

**Чарговы фэст «Рок па вакацыях», які меў адбыцца 2 верасня, перанесены на месяц. У мінскім клубе «Рэактар»** мелі зайграць **«Neuro Dubel»**, **«Крама»**, **«Drum Ecstasy»**, **«Безбилета»**, **«Авангардшкола»** і **«Зьмяя»**. **«Канцэрт перанесены на 2 кастрычніка**, прычыны — тэхнічныя», — коратка патлумачыў арганізатар фэсту Павел Кашырын. Фестываль аднаго дня «Рок па вакацыях» быў надзвычай папулярны ў 1990-х.

**ЛК, СП**



## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

### Разамкнутыя абдымкі




**Los abrazos rotos**

Іспанія, 2009, каляровы, 129 хв.

**Рэжысёр:** Педра Альмадовар

**Ролі выконваюць:** Пенелопа Круз, Луіс Амар, Бланка Партыльё, Хасэ Луіс Гомес, Тамар Новас, Рубэн Ачандыяна

**Жанр:** Драма

**Адзнака:** 7 (з 10)

Асляплы пасля аўтакатастрофы рэжысёр (Луіс Амар) узгадвае мінулае і фільм, у якім здымалася яго каханка Лена (Пенелопа Круз). Прадусар карціны, багаты палюбоўнік Лены, сачыў за героямі, пераследаваў іх і планаваў помсту. Таямніцы мінулага раскрываюцца, новыя сувязі знаходзяцца, пачуцці ўзгадваюцца і адначасова, кіно — з'яўляецца.

Ранні Педра Альмадовар шакаваў публіку постмадэрнісцкімі фарбамі і дзікімі любоўнымі шматкутнікамі. Позні Альмадовар, якога многія лічаць стомленым, мудрым і ўдумлівым. Ён пераводзіць самыя мыльнадрамныя сюжэты ў высокую трагедыю, прасякнутую спачуваннем і цеплынёй жыцця.

Ад ранняга Альмадовара — чырвоныя памідоры, барвовыя сукенкі, пунсовыя пантофлікі. Фільм у фільме — з недаробленаю камедыяй, што з тонкай ірoніяй паўтарае альмадоварскі шэдэўр «Жанчыны на мяжы нервовага зрыву».

Амаль дэтэктыўная гісторыя з нечаканымі паваротамі — толькі нагода, каб адчуць пах салёнага мора і святло вячэры з любым чалавекам. Гэта гісторыя дараванняў — і позірку, які адкрываецца, калі вочы ўжо не бачаць.

Сэрца здольнае бачыць, калі і фарбы бляknуць, і крыкі сціхаюць.

**Андрэй Расінскі**

### Мамін блокбастэр




Юбілей аднаго з найпаспяховых беларускіх дзіцячых фільмаў «Дзяўчынка шукае бацьку».

50 гадоў таму нашым, тады малым, мамам і татам беларускія гарады маглі прапанаваць няшмат забаваў: пясочніца і гульня ў «чушку» ў дворы. Ні табе дзіцячых кавярняў і паркавых атракцыёнаў, ні табе тэлевізара, які тымі гадамі быў у лічаных кватэрах. Таму паход у кіно рабіўся амаль адзінай атракцыяй для савецкіх беларусянятаў.

50 гадоў таму дзіцячы фільм «Дзяўчынка шукае бацьку» зрабіўся лідэрам пракату, сапраўдным блокбастэрам: толькі за 1959 год, толькі ў Савецкім Саюзе, яго паглядзела 35 мільёнаў чалавек. Да таго ж, фільм зрабіўся абсалютным рэкардсменам сярод беларускіх фільмаў паводле заказаў: для пракату ў сваіх кінатэатрах яго купілі 83(!) краіны свету.

Дырэктар Музея беларускага кінематографа Ігар Аўдзееў лічыць, што сакрэт поспеху «Дзяўчынка шукае бацьку» ў тым, што ў стужцы ўсё зроблена паводле канонаў старога добрага прыгодніцкага жанру: усе сюжэтныя хады строга, па-жыццёваму, абумоўленыя, а ў кут ставіцца захапляльнасць, вастрыня сюжэту, а не ідэалогія. Немцы ў стужцы не законча злыдні, а хутчэй класічныя адмоўныя героі. Сілы Ліха дзейнічаюць са сваёй жалезнай логікай, і ў гледача з'яўляецца давер да сюжэту. Калі ідэалагічны пасыл у фільме і існуе, дык у аблегчанай, «дзіцячай» версіі.

Паглядзець стужку, якой захапляліся вашы мамы і таты, можна **16 верасня а 12 у будынку Музея беларускага кіно (вул.Свярдлова, 4, недалёка ад плошчы Незалежнасці)**.

**ЛК**




# НЕЗАЛЕЖНАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ. ПРА БЕЛАРУСЬ БЕЗ ЦЭНЗУРЫ

«Белсат TV» ужо другі год вітае цябе ў тваім доме! Праз спадарожнікі «Sirius» і «Astra» нас глядзіць ужо больш за шэсцьсот тысяч беларусаў! «Белсат» – гэта адзінае тэлебачанне па-беларуску, на тваёй роднай мове. Штодзённа ў нас – праўдзівая інфармацыя, галоўныя падзеі, важныя факты, цікавая публіцыстыка, карысная аналітыка, найлепшыя беларускія і сусветныя дакументальныя рэпартажы, мастацкія фільмы і серыялы, культурніцкія і забаўляльныя праграмы. Глядзі сваё – кожны дзень з 19:00. Далучайся!

## НАВІНЫ

**Без цэнзуры**

ПРАЎДЗІВА!

**«Аб'ектыў»** – гэта штодзённыя 20 хвілінаў актуальнай інфармацыі. У дадатку – навіны спорту і надвор'е. Падзеі асвятляюць найлепшыя незалежныя тэлежурналісты Беларусі. «Аб'ектыў» – гэта інфармацыя з твайго гораду, рэгіёну і свету. Мы там, дзе на цябе забыліся іншыя. Глядзі «Аб'ектыў» таксама ў інтэрнэце – www.belsat.eu.

## ПУБЛІЦЫСТЫКА

**Без табу**

КАНСТРУКТЫЎНЫ ДЫЯЛОГ! ВАЦЛАЎ ГАВЭЛ, АЛЯКСАНДР КАЗУЛІН, АЛЕСЬ ПУШКІН, АНДЖЭЛІКА БОРЫС, АЛЯКСАНДР МІЛІНКЕВІЧ, ЗЯНОН ПАЗЬНЯК, ЛЯВОН ВОЛЬСКІ І ІНШ.

**Штопятніцу** аўтарская праграма Паўла Мажэйкі **«Госць «Белсату»**. У нашай студыі вядомыя, цікавыя, кампетэнтныя, неардынарныя асобы Беларусі ды свету.

БЕЛАРУСЬ У ЕЎРОПУ!

Штотыдзень **у нядзелю** Беларусь адчыняе **«Акно ў Еўропу»** разам з Дзмітрыем Гурневічам. Незалежная інфармацыя пра падзеі ў Беларусі ды Еўропе, эканоміка, мастацтва і права, 60 секундаў вакол Еўропы, цікавы госць у студыі.

«БЯСПЛАТНАЯ» МЕДЫЦЫНА? ЧАМУ БЕЛАРУСЫ НЕ ХОЧУЦЬ МЕЦЬ ДЗЯЦЕЙ? ЦІ ПАТРЭБНАЯ АДМЕНА СМЯРОТНАГА ПАКАРАННЯ? ЦІ ДЗЯРЖАВА РАЗУМНЕЙШАЯ ЗА СВАІХ ГРАМАДЗЯНАЎ?

**У нядзелю** паўдзельнічай у дыскусіі разам з Эдуардам Мельнікавым і ягонымі гасцямі ў віленскай студыі ток-шоу **«Форум»**.

З «БЕЛСАТАМ» ЗАЎСЁДЫ ПРЫ ГРАШАХ!

**У панядзелак** заплануй свой хатні бюджэт, звядзі дэбет з крэдытам, перамажы крызіс і навучыся правільна інвеставаць разам з нашымі эканамічнымі праграмамі **«Асабісты капітал»** і **«Сальда»**.

ТЫ МАЕШ ПРАВА!

**У чацвер** ты даведаешся, якія маеш правы, хто іх парушае і як іх правільна і эфектыўна бараніць, – у праграме **«Маю права»** з вядомым юрыстам Андрэем Бастунцом.

## ПРАГРАМЫ ДЛЯ ДАРОСЛЫХ, МАЛАДЫХ І САМЫХ МАЛЕНЬКІХ!

АДКУЛЬ НАШ РОД? ЛЮДЗЬМІ ЗВАЦЦА...

**Штодзённа** цябе чакае некалькі хвілінаў у глыбіні стагоддзяў. Жыццё чалавека і шлях цэлага народу – у **«Гісторыі пад знакам Пагоні»**.

РЭЧАІСНАСЦЬ БЕЗ БЕЛЫХ ПЛЯМАЎ!

З лістапада на **«Белсаце»** фільмы і рэпартажы найлепшых беларускіх дакументалістаў у новым цыкле **«Героі не-нашага часу»**. Ніхто не забыты, нішто не забыта? Ці гэтая формула дзее ў сучаснай Беларусі? Дзе яны – беларускія героі савецкага часу: заслужаныя камбайнеры, лекары, навукоўцы, спартоўцы, дзеячы? Як яны з сённяшняй перспектывы ацэньваюць тыя часы?

ПАДАРОЖНЫЯ НАТАТКІ ПРА ЕЎРОПУ БЕЛАРУСКАГА АЎТАСПЫННІКА!

**У суботу** – час паехаць у падарожжа аўтаспынам: паглядзець, як жывуць у Еўразвязе, што ведаюць пра Беларусь. Разбураем стэрэатыпы і зносім межы паміж людзьмі – запрашаем **«Аўтастопам праз Еўропу»**.

«БАЮ-БАЙ! ВАЧАНЯТЫ ЗАКРЫВАЙ...»

**Увага!** Для нашых маленькіх гледачоў з кастрычніка штотыдзень у пятніцу, суботу і нядзелю пасля 19:00 – калыханка! Казку па-беларуску распавядзе і заспявае Мішка ў праграме для дзяцей – **«Аблавушак»**. Запрашаем у краіну цудоўнага «Дабранач»...

## ДАКУМЕНТАЛІСТЫКА І РЭПАРТАЖЫ

**Праўдзівы свет**

ПАЗНАЙ САПРАЎДНУЮ БЕЛАРУСЬ!

Зазірні ў нашую мінуўшчыну! Якая таямніца хаваецца за смерцю Станіслава Булак-Балаховіча – першага генерала Беларускай Народнай Рэспублікі? Глядзі фільм **«Генерал нясконачанай вайны. Булак-Балаховіч»**.

Узгадай трагічныя лёсы Бацькаўшчыны, час, калі загінуў кожны чацвёрты беларус! Часам белае падаецца чорным – і наадварот, калі верыць афіцыйнай ідэалогіі. Нестандартны погляд на Другую сусветную вайну – у фільме **«Беларусь пад нямецкай акупацыяй. 1941–1944»**.

Даведайся пра кулісы каляровых рэвалюцыяў і моладзевы рух пратэсту ў Грузіі, Сербіі, Украіне і Беларусі, пазнай, хто яны – **«Рэвалюцыянеры эпохі PR»**.

Унікальныя архіўныя кадры пра ўдзел афіцыйных, дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі ў выбарчых палітычных маніпуляцыях – у найноўшым фільме Ю. Хашчавацкага **«Лабатамія»**.

І нарэшце паглядзі вачыма без ружовых акуляраў на сучасную Беларусь – пра штодзённае, поўнае дробных клопатаў і радасцяў жыццё адной палескай сям'і распавядзе малады беларускі рэжысёр А. Куціла ў фільме **«Днюка»**.

ТОЛЬКІ ПРАЎДА НАСАМРЭЧ ЦІКАВАЯ!

## МАСТАЦКІЯ ФІЛЬМЫ І СЕРЫЯЛЫ КУЛЬТУРА І ЗАБАВА

ДЛЯ ЎСЁЙ СЯМ'І

Сусветныя кінапрэм'еры на «Белсаце» ў **«Суботнім сеансе»**. Фільм для сапраўднага беларускага мачо ці рамантычнай гераіні? У нас кожны задаволіць свой густ, бо ў самотныя суботнія вечары ў нас бываюць зоркі экрану – Пэнэлопа Крус, Джэк Нікалсан, Антоніё Бандэрас, Жан Клод ван Дам і не толькі.

**Штонядзелю** для аматараў высокага кіно – **«Фільматэка майстроў»**: творы сусветнавядомых рэжысёраў. Каго маеш жаданне пабачыць гэтым разам? Бэргмана, Лінча, Джармуша ці Ўон Кар-Ўая?

Толькі ў нас – сусветнавядомыя **серыялы** ў беларускай версіі. Калі любіш змаганне, ваенныя інтрыгі ды хуткасць, то адмыслова для цябе з 18 кастрычніка – серыял **«Таямніца крэпасці шыфраў»**. Адкрый у сабе Штырліца!

Увечары перад начным «Аб'ектывам» – час зняць працоўны стрэс. Для цябе міні-сатыра: **«Калыханка»** і **«Жаўтуха»**, або гумарысты Саша і Сірожа з праграмаю для дарослых.

**У суботу** навінкі музычных жанраў, зоркі, канцэрты і прэзентацыі наблізяцца да цябе дзякуючы музычнаму крытыку Змітру Падбярэзскаму і праграме **«Кухня»**.

ДА СУСТРЭЧЫ НА «БЕЛСАЦЕ»!

**«БЕЛСАТ» ГЛЯДЗІЦЕ ШТОДНЯ З 19:00 ДА 23:00.**

**«БЕЛСАТ TV»** – ГЭТА ТЭЛЕБАЧАННЕ ПА-БЕЛАРУСКУ, ДАСЯЖНАЕ Ў ТВАІМ ДОМЕ ПРАЗ СПАДАРОЖНІКІ «SIRIUS» І «ASTRA».

«SIRIUS 4»
(ПАЗІЦЫЯ 5 Е, ПАЛЯРЫЗАЦЫЯ Н, ЧАСТАТА 12379,6 МГЦ)

«ASTRA 1 KR»
(19,2 Е, ПАЛЯРЫЗАЦЫЯ Н, ЧАСТАТА 10773 МГЦ)

Калі ты яшчэ не паспеў падлучыцца – запытайся ў найбліжэйшай краме са спадарожнікавымі антэнамі, як гэта зрабіць. Набытую талерку можна заінсталяваць самастойна – і гэта сапраўды проста! Кошт сатэліты – 240 тыс. Нядорага, дый глядзець можна разам з суседзямі!

**КАНТАКТ:**

Калі хочаш глядзець «Белсат» або маеш пытанні тэхнічнага характару, звяртайся да нас: technik@belsat.eu
Пішы нам на адрас абаненцкай скрыні: **а/с 383, 220013, Менск** альбо на адрас электроннай пошты: info@belsat.eu
Рэдакцыя «Аб'ектыву»: abjektyu@belsat.eu

**Болей інфармацыі:** www.belsat.eu
Свае пытанні, заўвагі, прапановы можаш пакідаць у нашай скрыні ці на дыскусійным форуме www.belsat.eu/forum

Нашую праграму перадачаў на тыдзень можна знайсці ў інтэрнэце на www.belsat.eu і ў газетах: «Народная Воля», «Наша Ніва», «Новы Час», «Бабруйскі кур'ер», «Борисовские новости», «Брестская газета», «Вольнае Глыбокае», «Газета для Вас», «Газета Слонімская», «Ганцавіцкі час», «Intex-Press», «Інфа-Кур'ер», «Нясвіжскі час», «Рэгіянальная Газета».

›› www.belsat.eu

# «Касметыка і дыеты — мужчынская справа»

**Некаторыя хлопцы сёння разбіраюцца ў модзе і касметыцы не горш за дзяўчат.**

З'явілася нават назва для такіх — метрасэксуалы. Карэспандэнт «НН» пагутарыла з адным з прадстаўнікоў сучасных дэндзі Сяргеем Гумінскім.

**«НН»: Сяргей, ты гей?**

**СГ:** Не. У мяне ёсць дзяўчына, вельмі прыгожая.

**«НН»: У нашым грамадстве ёсць стэрэатып, калі мужчына сочыць за сваім выглядам, то ён нетрадыцыйнай арыентацыі...**

**СГ:** Я думаю, што гэта прапаганда і стэрэатып навязаны савецкімі непрыгожымі жанчынамі. І мужчынамі, якія лічаць, што хлопец павінен быць трошкі прыгажэйшы за малпу. Жанчына, якая сябе паважае, ніколі такога не скажа. Ёй будзе хацецца, каб побач быў прыгожы хлопец. Гэты стэрэатып навязаны няўдачнікамі.

**«НН»: Раскажы, як ты сочыш за сваім выглядам. Што робіш?**

**СГ:** На дыетах сяджу. Некаторыя сябры кажуць, што я анарэксік. Я разумею, што худы, але як толькі ў мяне ўзнікаюць лішнія формы, адразу сядаю на дыету. Збіраюся перайсці ў вегетарыянцы, ужо рыхтуюся маральна. Хацэ ў мяне і так рацыён — кісла-малочныя прадукты, шакалад і злакавыя. Вельмі мала ем звычайнай ежы.

**«НН»: Колькі ты важыш?**

**СГ:** 62 кілаграмы. У мяне норма 61-62. Калі я скідваю да шасцідзесяці, то адчуваю сябе не вельмі добра. Аднак назіраю, бывае, маладыя хлопцы па 20 гадоў, і ў іх тлушч вісіць. Не хачу быць такім. У мяне адна з фобій — я старасці баюся.

**«НН»: Цябе палохае смерць ці нешта канкрэтнае ў старасці?**

**СГ:** У старасці пачнуцца праблемы са здароўем, зменіцца знешні стан. Дарэчы, я карыстаюся ўжо гелем супраць зморшчынаў пад вачыма. Я люблю сябе і хачу жыць вечна.

**«НН»: Якімі яшчэ касметычнымі сродкамі ты карыстаешся?**

**СГ:** Крэмамі «Джонсан», якія даюць эфект «цела, як у дзіцяці пасля сну». Маскі для валасоў, каб валасы не псаваліся, бо я фарбуюся. Ледзьве не штодня раблю ўкладку валасоў, бо сушыць галаву халодным фенам не заўсёды маю часу.

**«НН»: Колькі ў цябе розных крэмаў дома?**

**СГ:** Два для рук, тры для твару і адзін для валасоў. Калі праз месяц паеду ў Польшчу, яшчэ пачну карыстацца маскамі для амаладжэння твару і рук. У Беларусі баюся набываць касметыку, таму абмяжоўваюся тым, што ёсць. Я аддаю перавагу ізраільскай касметыцы на мінералах. Яна вельмі добрая па якасці. Аднак у Беларусі такой няма. Калі я ў Оршы шукаў яе ў крамах, на мяне глядзелі, як на экспанат у цырку.

**«НН»: Адкуль такая зацікаўленасць касметыкай узнікла?**

**СГ:** Калі ты добра выглядаеш, гэта надае большай упэўненасці. Мне ўсё жыццё казалі, што я прыгожы. Раней я ў гэта не верыў. Потым надышоў час, калі я пачаў квітнець, і захацелася яшчэ больш гэта прагрэсаваць.

**«НН»: Як сябры ставяцца да тваёй увагі да сябе?**

**СГ:** Station Становча ў асноўным. Для некаторых напачатку было дзіка. Аднак я бачу, што раней я адзін у нашай кампаніі карыстаўся касметыкай, а цяпер многа хто пачаў купляць крэмы. Некаторыя ўжо раіцца прыходзяць.

**«НН»: Сустракаюцца, хто зусім цябе не разумее?**

**СГ:** На вуліцы часам. Ідзе такі электарат, у беларускім разуменні гэтага слова, і кажа, што я пі..р. Я звычайна адказваю: паглядзіце, з якімі прыгожымі дзяўчатамі я хаджу, і на тых, з кім вы ходзіце. А пазней паглядзім, хто з нас натурал. Бываюць выпадкі агрэсіўныя, але я ведаю, што змагу пастаяць за сябе — я займаюся муайтай, тайскім боксам.

**Настасся Шамрэй**



21-гадовы Сяржук Гумінскі карыстаецца двума крэмамі для рук, трыма для твару і амаладжальнымі маскамі.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Сяргей Гумінскі**

нарадзіўся ў Оршы. Вучыўся ў Светлагорскім індустрыяльным тэхнікуме. Быў адлічаны з 3-га курса за палітычную дзейнасць і цяпер навучаецца па праграме Каліноўскага ў Польшчы. У лістападзе споўніцца 21 год.

**Метрасэксуал**

тэрмін прыдуманы ў 1994 брытанскім журналістам Маркам Сімпсанам для абазначэння тых сучасных мужчынаў, якія выдаткоўваюць шмат часу і грошай на свой выгляд і лад жыцця. Тэрмін «метрасэксуал» супрацьлеглы тэрміну «мача». У XIX ст. быў падобны феномен пад назвай «дэндзі».

**Анарэксія**

поўная альбо частковая адмова ад ежы пад уплывам псіхапаталагічных разладаў.

ТЭЛЕПРАГРАМА НА 14–20 ВЕРАСНЯ

# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 14 верасня, панядзелак

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 18 серыя
**19:50** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:20** Госць «Белсата»: Сяргей Сацук
**20:40** Хто ёсць кім: Алесь Мех — беспрацоўны інжынер
*Алесь Мех — інжынер з Кобрына, спецыяліст-газаўшчык з больш як дзесяцігадовым стажам — страціў працу. Ягоная віна была ў тым, што ён — чалавек з актыўнаю грамадскаю пазіцыяй, цікавіцца палітыкаю: на выбарах у палату прадстаўнікоў спадар Алесь выставіў сваю кандыдатуру ад Партыі БНФ. Перад выбарамі яго запрасіў да сябе дырэктар ягонага прадпрыемства на размову, у якой удзельнічаў і кіраўнік мясцовага КДБ. Афіцэр яму адкрыта загадаў зняць сваю кандыдатуру, у адваротным выпадку Мех згубіць працу і не зможа яе знайсці ва ўсёй Беларусі. Інжынер запісаў гэтую размову і апублікаваў. Працу ён сапраўды страціў і цяпер мусіць жыць на сродкі жонкі-настаўніцы. Праўды шукае ў судах. Але ў цяперашні час — гэта толькі марнаванне часу.*
*Гісторыя гэтага мужнага, паважанага ў сваім горадзе чалавека — своеасаблівы голас у дыскусіі пра т. зв. «адлігу» ў Беларусі, пра «аднаўленне» свабоды слова, пра «слабасць апазіцыі» і яе «паразу» на апошніх парламенцкіх выбарах.*
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:25** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Дзяржавы» (спазнаваўчая праграма)
**21:30** «Англійскі тракт», маст. фільм, рэж. Антоніё Бандэрас, 2006 г., Вялікабрытанія—Іспанія—ЗША.
**23:20** Аб'ектыў

### 15 верасня, аўторак

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:10** МакраФон: З архіву «Jazz Jamboree»: «Archie Shepp Group», ч. 1
**19:40** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**20:10** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**20:40** Сальда (эканамічная праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:25** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ці існаваў старажытнарускі народ?» (спазнаваўчая праграма)
**21:30** Рэпартэр (публіцыстычная праграма)
**22:00** Аўтастопам праз Еўропу, 1 серыя: «Польшча»
**22:15** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**22:40** Аб'ектыў

### 16 верасня, серада

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:10** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**19:35** Без рэтушы: «Стваральнікі пераможцаў», дак. фільм, 2009 г., Польшча
**20:00** «Сакрэтная гісторыя архіпелага ГУЛАГ», дак. фільм, рэж. Жан Крэпю, 2008 г., Францыя
*У гісторыі літаратуры можна знайсці няшмат кніг, якія паўплывалі на свядомасць грамадства і на само развіццё падзеяў у свеце. Адна з іх — трохтомнік Аляксандра Салжаніцына «Архіпелаг ГУЛАГ». Аўтары фільма расказваюць гісторыі публікацыі твора.*
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:25** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Міндоўг» (спазнаваўчая праграма)
**21:35** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 24 серыя
**22:25** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы
**22:40** Аб'ектыў

### 17 верасня, чацвер

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 18 серыя
**19:30** Кухня (музычна-публіцыстычная праграма)
**19:50** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:15** «Паэма веры», дак. фільм, 2007 г., Беларусь
**20:40** Маю права (прававая праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:25** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Гедымін» (спазнаваўчая праграма)
**21:35** «Сакрэтная гісторыя архіпелага ГУЛАГ», дак. фільм, рэж. Жан Крэпю, 2008 г., Францыя
**22:25** Сальда (эканамічная праграма)
**22:40** Аб'ектыў

### 18 верасня, пятніца

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Дэтэрмінатар», серыял: 11 серыя
**19:50** Жаўтуха (сатырычная праграма)
**20:15** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «7 разоў Масква», дак. фільм, рэж. Пётр Стасік, 2009 г., Польшча
*«7 разоў Масква» — гэта спроба разгадаць таямніцы вялікага горада статычнаю камераю, усталяванаю ў сямі характэрных пунктах мегаполісу. Ля аднаго са сталінскіх хмарачосаў у кадр трапіў вясельны стол з белым абрусам. У наступным эпізодзе камера ўжо пасярод праспекта, запоўненага тысячамі аўто. І калі на яе наязджае тралейбус, мы трапляем на эскалатар метро. Падняўшыся на паверхню разам з маўклівымі пасажырамі, камера будзе разглядаць маляўнічага юнака, які раздае мінакам улёткі. Доўга не затрымаўшыся на ім, камера павядзе нас у царкву, да цёплых агеньчыкаў свечак. І адразу ж у пакой абшарпанага блочнага шматпавярховіка, дзе дажывае свой век самотная бабулька.*
**20:35** Госць «Белсата»
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Беларусы ў Грунвальдскай бітве» (спазнаваўчая праграма)
**21:30** «Без абязбольвання», маст. фільм, рэж. Анджэй Вайда, 1978 г., Польшча.
**23:20** Аб'ектыў

### 19 верасня, субота

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** Аўтастопам праз Еўропу, 2 серыя: Нямеччына
**19:20** «ПНР дэ люкс», дак. фільм, рэж. Эдыта Врублеўска, 2007 г., Польшча
**19:40** YoLife! (моладзевая праграма)
**20:00** Еўропа сёння (тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:25** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:15** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Крэўская унія» (спазнаваўчая праграма)
*Канец XIV стагоддзя стаў цяжкім часам для нашай гісторыі. Складаныя ўнутраныя адносіны і напружаная міжнародная сітуацыя вымусілі эліту ВКЛ шукаць падтрымкі ў суседніх краінах. Такі выбар зрабіў Ягайла.*
**21:25** Суботні сеанс: «Мужчынскі клопат», камедыя, рэж. Боб Рафэлсан, 1992 г., ЗША.
*Невядомы злачынец пераследуе спявачку Джоан. Яна звяртаецца ў фірму «Ахоўныя сабакі», гаспадар якой Гэры шчыра імкнецца ёй дапамагчы. Паміж імі ўзнікаюць пачуцці...*
**23:00** Аб'ектыў




### 20 верасня, нядзеля

**19:00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**19:15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 19 серыя
**20:05** «Бульбаны», мультсерыял
**20:10** Форум (ток-шоу): «Сексуалізацыя нашага побыту»
**21:00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21:30** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**22:00** Фільматэка майстроў: «Пачатковая школа», камедыя, рэж. Ян Сверак, 1991 г., Чэхаславакія.
*1945 год, у Чэхіі пачынаюцца палітычныя і сацыяльныя змены, паказаныя вачыма вучняў пачатковай школы, для якіх, вядома ж, забава важнейшая за вялікія праблемы.*


Кобрын (Брэсцкая вобласць) рыхтуецца да грандыёзных дажынак.

PHOTO.BYMEDIA.NET

## АНЕКДОТЫ

Пара беларусаў заходзіць у аўтасалон. Мужчына з нецярплівасцю цягне жонку да новага «Мерсэдэса»:

— Глядзі, вось такую мадэль я хачу, каб Гена мне прыгнаў з Германіі праз 10 гадоў!

* * *

— Патлумачце мне нарэшце, чым адрозніваецца хабар ад карупцыі?

— Усё проста: хабар — гэта калі ўзялі і зрабілі, а карупцыя — калі ўзялі, але не зрабілі. І з гэтай язвай на целе грамадства трэба бязлітасна змагацца!

* * *

Прадам готовы бізнэс: месца ля метро, скрынка для грошай, гітара.

* * *

Адна карова — другой:

— Ведаеш, мне здаецца, што яны нас кормяць толькі, каб піць наша малако, а потым забіць і з'есці...

— Ізноў ты са сваімі тэорыямі змовы! З цябе ўжо і так увесь хлеў смяецца!

* * *

Самай эфектыўнай антыкрызіснай мерай урада стала пашырэнне спіса грыбоў, якія можна лічыць ядомымі.

## ГАЗЕТКА ДЗЕТКАМ

### СЛОН І ПАРАСОН

**У краму наведаўся слон:**
**— Хачу я купіць парасон!**
**— Дзівак! — на слана паглядзеў**
**І ўсміхаецца леў.**
**— Ляжаць парасоны, ды тут**
**Патрэбен, відаць, парашут!**
**Шукаеш яго ты дарма —**
**Такіх парасонаў няма!**

**Мікола Хамянкоў**

Больш вершаў для дзяцей — на сайце kazki.by

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Лынгмяны, Віл. губ. Свянцянскага пав.** Тутэйшыя сяляне падалі заяву, што хочуць рассяліцца на хутары, але, як прыехала камісія, дык знайшлося ўсяго 23 ахвотнікі. Каб праверыць планы і намовіць сялян, застаўся там каморнік Рэнігер; на яго напала 40 баб з палкамі і адабралі ўсе інструменты. Земскі засудзіў 8 мужчын на 7 дзён, а 18 кабет на 14 — адседкі. Вельмі яшчэ цёмны тутэйшы народ і не можа зразумець сваёй карысці.

**«Наша Ніва». №34. 1909**

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

**Некаторыя кіруюць і па 40 гадоў. Палкоўнік Муамар Кадафі адзначае юбілей свайго прыходу да ўлады ў краіне, якую ён ператварыў у Лівійскую Джамахірыю. На фота: прымае парад за куленепрабівальным шклом.**


REUTERS

**Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі (першы злева) сціпла пастаяў сярод лідэраў дзяржаваў на 170-х угодках пачатку Другой сусветнай вайны ў Гданьску.**




REUTERS

**У Нью-Ёрку аднавіліся здымкі фільма «Sex and the City — 2», у нашым пракаце вядомага як «Сэкс у вялікім горадзе». У нью-ёркскім раёне Вэст-Вілідж здымалася сцэна з удзелам Сары Джэсікі Паркер і Сінтыі Ніксан.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

**Найдаражэйшага нам, любімага Коўкеля Івана Тарасавіча** віншуем з 75-гадовым юбілеем. Многая лета, татухна!

### ФОЛК-ДЫЗАЙН

**Майстэрня «фолк-дызайну» запрашае** на заняткі дзяцей, падлеткаў, моладзь (саломапластыка, маляванне, праца з лямцам). Адрас: вул.Кірава, 14, аўд.308. Т.: (029) 312-54-71

### ШЧАНЮКІ

**Прадам** шчанюкоў (3 месяцы) заходне-сібірскай лайкі з цудоўнай радаслоўнай. Т.: (029) 952-55-07

### ЖЫТЛО

**Два беларускамоўныя хлопцы (не студэнты) здымуць** двухпакаёвую кватэру ў Мінску. Своечасовасць аплаты і парадак гарантуем. Тэл.: (029) 756-12-18 (Алесь) і (029) 113-40-41 (Алег)

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Антон Астаповіч запрашае** ў краязнаўчае падарожжа 27 верасня па маршруце: Мінск—Лагішын—Парэчча—Пінск—Мінск. Т.: (029) 111-73-32, (017) 262-73-43

Наша Ніва
незалежная газета
заснаваная ў 1906, аднoўленая ў 1991
галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).
сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Мінск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@nn.by
On-line: www.nn.by

©НАША НІВА. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6165. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 08.09.2009.
Замова № 4914.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
ISSN 1819-1614
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12